

ЧЫРВАНАКНІЖНІКІ ПАД ПРЫЦЭЛАМ

КАРАНІ І КРОНЫ

ВЕРА ПАЛЯКОВА: «СПЕКТАКЛЬ – ГЭТА ПРАДУКТ» 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 МАЯ 2022 г. АЎТОРАК № 104 (29726)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый ЧАБАТАР, намеснік міністра эканомікі**

*«Сёння IT-галіна нашай краіны — гэта напрамак, які дынамічна развіваецца. Яго доля ў ВУП перавышае 7 працэнтаў, і мы бачым істотны патэнцыял для далейшага росту. Зараз Мінэканомікі актыўна ўдзельнічае ў рабоце па лічбавізацыі дзяржавы, прасоўваючы такі важны для бізнесу напрамак, як перавод у электронны фармат адміністрацыйных працэдур, дае магчымасць доступу да электроннага рэестра ліцэнзій. Таксама ў найбліжэйшы час мы будзем аказваць адпаведныя лічбавыя паслугі па адміністрацыйных працэдурах. Мы штогод арганізоўваем вытворча-практычную канферэнцыю па смарт-індустрыі. Цяпер гэтае пытанне цікавіць многіх, хто паглыблены ў вытворчы парадак дня і павышэнне эфектыўнасці. Гэтая канферэнцыя пройдзе ў рамках ТІВО-2022. Пастараліся запрасіць на яе максімальна шырокае кола экспертаў — як беларускіх, так і замежных — для насычанага і прадукцыйнага дыялогу».*

# Якім ты будзеш, жыццё?



Апошні званок — хвалюючая падзея як для адзінаццацікласнікаў, так і для іх бацькоў, настаўнікаў. Узнагароды, віншаванні, словы падзякі, вальс... Усё гэта цудоўна, але што рабіць, калі надвор'е перашкаджае планам? З самага ранку ў Кобрыне неба было зацягнута хмарамі, ліў дождж. Але лінейку, прысвечаную апошняму званку, у мясцовай гімназіі ніхто не адмяняў. Нягледзячы на тое што фасад школы ўжо быў упрыгожаны паветранымі шарыкамі і плакатам з тэматычным надпісам, адміністрацыя вырашыла перанесці мерапрыемства ў спартыўную залу.

**Андрэй ШУГАЙ і Таісія ПАХОМСКАЯ** — вучні 11 «А» класа гімназіі г. Кобрына. 30 мая і для іх прагучаў апошні званок. Зусім хутка — выпускныя экзамены і ЦТ. У Андрэя ёсць дыплом III ступені абласной алімпіяды па геаграфіі. Гэта дае магчымасць хлопцу паступіць на педагагічную спецыяльнасць без экзаменаў. Таісія — выдатніца і таксама алімпіядніца, але яе прадмет — грамадазнаўства. Яна заняла трэцяе месца ў вобласці. У будучыні марыць звязаць сваё жыццё з правазнаўствам.

Мы зрабілі фотарэпартаж, каб паказаць, як у кобрынскай гімназіі прагучаў апошні званок. Як гэта было, глядзіце на zviazda.by.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

Прафарыенцір

## ШАНЦЫ СТАЦЬ СТУДЭНТАМ ПАВЫШАЮЦЦА?

Льготы для выпускнікоў профільных класаў, мэтавая падрыхтоўка і ўніверсітэцкія алімпіяды



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Прыёмная кампанія 2022 года пройдзе ў звыклым для абітурыентаў фармаце з невялікімі карэкціроўкамі. А вось у наступным годзе адбудзецца шмат змен, пра якія цяперашнім дзесяцікласнікам трэба ведаць і рыхтавацца да іх загадзя. Пачынаючы з 2023 года паступленне ў ВНУ будзе ажыццяўляцца на падставе сертыфікатаў цэнтралізаванага экзамену, вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання (па профільных прадметах), а таксама сярэдняга бала дакумента аб адукацыі. Мяркуецца, што ўсё гэта павысіць адказнасць настаўнікаў за вынікі сваёй работы і зменшыць нагрузку на вучняў 11-х класаў. Але аб усім па парадку...**

СТАР. 3

Зварот у рэдакцыю

## «ДАПАМАЖЫЦЕ, БО НЯМА СІЛ ЦЯГАЦЬ ВЁДРЫ З ВАДОЙ»,

### або Непаразуменні вакол каналізацыі

**«Няма лепшага сваяка, чым добры сусед», — любіць паўтараць за кубачкам гарбаты мая суседка Галіна Фёдараўна. Але суседзяў не выбіраюць, і з імі, на жаль, шанцуе далёка не ўсім. Вельмі часта яблыкам разладу становіцца зямля. Часам, калі мірна дамовіцца не атрымліваецца, справа даходзіць да суда. Як вынік — высокія непраглядныя агароджы, якімі людзі адмяжоўваюцца адзін ад аднаго, «каб не бачыць і не чуць».**

СТАР. 7



Жыхары дзвюх кватэр звонку дом абабілі аднолькавым сайдынгам, у іх адна брамка на дваіх, агульныя ўваходныя дзверы і праход да ўчастка. У кватэру № 1 асобная брамка, асобны ўваход.

### КОРАТКА

- У «Зубраняці» дадзены рэспубліканскі старт летняй аздараўленчай кампаніі.
- **Бясплатныя кансультацыі пройдуць 1 чэрвеня ў агенцтвах па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры.**
- Акцыя па бязвыплатнай здачы крыві пройдзе ў Магілёве 14 чэрвеня.

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на ІІІ квартал і ІІ паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «УСЕ РЭЗЕРВЫ РОСТУ І РАЗВІЦЦЯ МЫ ПАВІННЫ ШУКАЦЬ У САБЕ. ІХ — МОРА, НАВАТ У ГЭТЫХ НЯПРОСТЫХ УМОВАХ»

**У краіне дастаткова рэзерваў для росту і развіцця эканомікі. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі заявіў на нарадзе, дзе абмяркоўваліся пытанні сацыяльна-эканамічнай палітыкі.**

«Нам ніхто не дапаможа, апроч нас саміх. Усе рэзервы росту і развіцця мы павінны шукаць у сабе. Іх — мора, нават у гэтых няпростых умовах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Адным з галоўных пытанняў сустрэчы стала абмеркаванне праекта закона «Аб удасканаленні сацыяльна-эканамічнай палітыкі», падрыхтаванага ўрадам. Дакумент устанаўлівае на 1,5 года новыя падыходы да эканамічнай палітыкі. Актуальныя прапановы ўрада Прэзідэнт падтрымаў, але збіраць іх у такую груваcткую форму, як закон, лічыць няварта́й справай.

Перад тым як накіроўваць гэты закон у парламент, нарада праводзілася з удзелам зацікаўленых бакоў. Палярныя меркаванні былі ў дзяржорганаў і распрацоўшчыкаў. Палажэнні дакумента закранаюць практычна ўсе сферы: інвестыцыі і фінансы, умовы для вытворчай дзейнасці, транспарт і лагістыку, сацыяльныя гарантыі насельніцтву.

«Нягледзячы на тое што прапанаваныя меры маюць часовы характар (да канца 2023 года), кожная з іх дастаткова сур'ёзная і ўносіць істотныя змены ў дзейнае рэгуляванне асобных працэсаў. І тут (найбольш парламентарыяў датычыцца) нам бы гэтымі часовымі мерамі не разбалансаваць і не дэстабілізаваць сацыяльна-эканамічную сітуацыю ў краіне. Як мне дакладваюць, мэтай падрыхтоўкі закона з'яўляецца імкненне ўстараніць негатыўны ўплыў заходніх санкцый на эканоміку Беларусі», — заўважыў кіраўнік краіны.

Айчынныя прадпрыемствы сапраўды сутыкаюцца з бар'ерамі, дадаў ён, якія закранулі ўсе этапы вытворчага працэсу і штучна створаны на вонкавым контуры.

«Нагадваю, цяжкасці — не нагода для панікі, але і разлічваць, што сітуацыя вырашыцца сама па сабе, не трэба. Як я ўжо казаў раней, і гэты прагноз апраўдваецца, у нас адбываецца фізічнае зніжэнне аб'ёмаў продажаў калію і нафтапрадуктаў», — адзначыў Прэзідэнт.

Паводле яго, праблемы з каліем і нафтапрадуктамі негатыўна паўплывалі ў цэлым на выніки прамысловага комплексу, а праз іх на транспарт, аптовы гандаль. Астатнія сектары працуюць з вынікам 100 працэнтаў і вышэй.

«Упэўнены, і з нафтай, і з каліем таксама разбяромся. Таму бягучыя задачы прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця 2022 года былі абазначаны: імкнуцца да 100 працэнтаў, але без вымывання дэфіцытных абаротных сродкаў і нарошчвання складоў, — сказаў Прэзідэнт. — Другая задача — забяспечыць занятасць людзей, не дапусціўшы спынення вытворчасцяў, захаваць хоць бы цяперашні ўзровень даходаў. У каго прадукцыйнасць працы вышэйшая, добра, няхай плацяць больш. Задача ўрада — падтрымаць бюджэтнікаў, пенсіянераў і сацыяльна неабароненых грамадзян. Усё, што абяцалі, трэба выканаць», — арыентаваў кіраўнік краіны.

Ён працягнуў, што інструменты вырашэння гэтых пытанняў таксама акрэслены: тэрміновая пераарыентацыя экспартных патокаў з Украіны і краін ЕС у Расію і Азію, жорсткая эканомія бюджэтных выдаткаў, агрэсіўнае імпартазамяшчэнне.

«Толькі зрабіць гэта трэба не да 2025 года, як было запланавана, а пажадана за год-паўтара. Прыярытэт таксама зразумелы: буйныя і малыя прамысловыя вытворчасці, і дзяржаўныя, і прыватныя. Галоўнае, каб яны працавалі сумленна, плацілі падаткі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што неабходна нагружаць і пытацца з улады ў раёнах. «Хопіць мясцовай вертыкалі лунаць у аблоках і чакаць указанняў «з цэнтра». Усе яны дадзеныя. Не замацуем у раёнах людзей шляхам стварэння вытворчасцяў і пераразмеркавання рэсурсаў — правалім усю справу. Спыніце адток спецыялістаў у абласныя гарады і сталіцу праз вылучэнне жылля, размеркаванне спецыялістаў ВНУ, ільготы і іншае — гэта вашы пытанні», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён яшчэ раз нагадаў «зямныя» задачы мясцовай вертыкалі:

- адзін-два новыя інвестпраекты на пяцігодку ў кожным раёне;
- два самыя слабыя сельгаспрадпрыемствы замацаваны персанальна за кожным старшынёй райвыканкама;
- адраджэнне райаграсэрвісу і перасоўных механізаваных калон;
- падваенне тэмпаў меліярацыі;
- вырашэнне пытання з пустымі дамамі і зямлёй.

Калі рэгіёнам не хапае паўнамоцтваў для эфектыўнага вырашэння гэтых праблем, Прэзідэнт просіць уносіць прапановы.

«Паўтару, генеральная задача ўлады — забяспечыць спакой грамадства, абараніць людзей і мінімізаваць уплыў рабаўніцкіх санкцый на працоўныя калектывы. Цешыць, што людзі і самі адэкватна разумеюць сітуацыю, падтрымліваюць наш мірны курс на развіццё і трымаюцца за працу», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны дадаў, што ўважліва вывучыў праект закона і ўбачыў шэраг мер, якія накіраваны на абарону дзяржаўных інтарэсаў і ўмацаванне нашай эканамічнай бяспекі. Ёсць у ім і пытанні кардынальнага пераагляду практыкі рэгулявання некаторых напрамкаў.

«Напрыклад, вы прапануеце мытныя і падатковыя адтэрміноўкі, мараторый на рост маёмасных падаткаў. Але як гэта паўплывае на даходы бюджэту? Такім чынам, на заробкі настаўнікаў, лекараў, выплату пенсій і дзіцячых дапамог? А гэта найбольш уразлівыя групы насельніцтва, якія залежаць ад бюджэту», — распавёў Прэзідэнт.

Наступнае пытанне ад яго: ці сапраўды забарона на выбарачныя праверкі, аптымізацыя нагрузкі пры атрыманні дазвольнай дакументацыі, змяненне крытэрыяў ацэнкі працы кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый павысяць дзелавую актыўнасць у краіне?

«Заказы ёсць, рынак неабдымны на ўсё, што мы ствараем. Неабходна ўпірацца і працаваць», — заўважыў А. Лукашэнка.

Ён пытаецца, ці выканаты баланс інтарэсаў пры выдзяленні адтэрміновак пагашэння спажывецкіх крэдытаў і крэдытаў на жыллё грамадзянам? А таксама пры забароне на павелічэнне ў 2022 годзе тарыфаў на цеплазабеспячэнне і электрычную энергію?

«Мае асцярогі па аднаімгенным прыняцці такога пласта рашэнняў: ці гатовы мы да гэтага? Ці не надуманыя гэта нормы, якія прыгожыя на паперы, але нічога не даюць на практыцы? Я нездарма запрасіў губернатараў і асобных галіновых міністраў. Пра ўзмацненне мясцовай вертыкалі сёння ўжо сказана. Але і стратэгію працы міністраў мы вызначылі даўно, — сказаў кіраўнік краіны. — Успомніце шквал крытыкі нашых псеўдалібералаў за ручное кіраванне асобнымі пытаннямі. Сёння без гэтага не абысціся».

Прэзідэнт акцэнтаваў: «Час вайсковы. Канкрэтныя меры і задачы — канкрэтныя тэрміны і вынікі. Вось і ўся формула. Няма ніводнай развітой краіны без матэрыяльнай асновы — ад энергетыкі да прамысловасці».

Аляксандр Лукашэнка падкрэслівае, што ўлады «дзяўбалі» за мадэрнізацыю флагманаў і традыцыйных галін? А сёння сельская і лясная гаспадарка даюць 10 мільярдаў долараў экспарту.

Пытаецца Прэзідэнт, што новы закон можа даць міністру замежных спраў, зыходзячы з яго галоўнай задачы раскруціцца ў Азіі, Афрыцы і Лацінскай Амерыцы? «Неабходна перанесці туды ўвесь груз працы пасольстваў і прадстаўніцтваў. Пакуль бачу толькі маленькія крокі».

Далей — прыклад прадпрыемства «Нафтан». Краіна ўклала ў яго мадэрнізацыю, па словах Аляксандра Лукашэнкі, больш за 1,5 мільярда долараў, пастаянна падтрымлівае па ўсіх пытаннях шматтысячны калектыў. «Чым гэты закон дапаможа «Нафтану», Мазыру, «Беларуськалію» пераадолець бягучыя праблемы і цяжкасці? Закон законам, але без таго, каб у бягучай сітуацыі вазіць калій «мяшкамі» ці дызель «бочкамі», мы не абыдземся. Час перадаплаты і самавывазу прайшоў. Падкасаць рукавы і адпрацоўваць кожны кантракт уручную. Ад спецыяліста да прэм'ера, а дзе патрабуецца — і да Прэзідэнта», — дадаў кіраўнік краіны.

Галоўныя пытанні Прэзідэнта да асноўнага дакладчыка, першага віцэ-прэм'ера Мікалая Снапкова, па законе былі наступныя: каго ён закране, што дасць для развіцця эканомікі ў цэлым, якія магчымыя рызыкі і пагрозы і ці можа жыць краіна, не змяняючы сваю сацыяльна-эканамічную палітыку.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА — АБ ПАДАРАЖАННІ ПАПУЛЯРНАЙ У БЕЛАРУСІ МАРКІ АЎТАМАБІЛЯ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па сацыяльна-эканамічных пытаннях выказаў крытыку ў сувязі са значным падаражаннем папулярнай у краіне маркі аўтамабіля.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на праблематыку, звязаную з ростам цэн, на прыкладзе канкрэтнага аўтамабіля: «Скажыце, колькі сёння каштуе легкавы аўтамабіль «Атлас» (Geely Atlas. — **«Зв.»**)? У доларах. Хто-небудзь мне можа сказаць? Чаго вы да мяне прыйшлі? Вы не ведаеце цэны на адзіны аўтамабіль, на які ёсць шалёны попыт і ў нас, і ў Расіі».

«27-28 (тысяч долараў ЗША. — **«Зв».**). У 25 не ўлазім», — адрэагаваў старшыня Камітэта дзяржкантролю Васіль Герасімаў.

«Не ўлазіце. Дык вось, было 27. А колькі цяпер, вы ўдакладніце і потым публічна журналістам скажаце. Ды ў вас цэны ў два разы выраслі. Вы ва ўрадзе гэта ведаеце? І вы што думаеце, народ будзе маўчаць? Вы мне цяпер расказваеце: і лагістыка, і грошы не так, і гэта не так... Слухайце, ну не ў два ж разы!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Згодна з інфармацыяй на сайце дылера, цана на самую танную камплектацыю за новы аўтамабіль Geely Atlas Pro стартуе з Br87,4 тыс. або амаль $34 тыс. па бягучым курсе. За самыя топавыя камплектацыі ўжо давядзецца заплаціць у раёне Br103 тыс. або амаль $40 тыс.

### Каментарый у тэму

**Першы віцэ-прэм'ер Мікалай СНАПКОЎ:** «У любой эканамічнай сітуацыі, асабліва бягучай, ураду неабходныя тры элементы работы на ўсіх узроўнях: аналіз сітуацыі, усведамленне сітуацыі і рашэнне сітуацыі. Чым хутчэй і больш якасна будзе прынятае рашэнне, тым лепш. Таму мы сёння абмеркавалі работу і аператыўна-сітуацыйнага штаба, якая праходзіць штодзённа, і працоўнай групы па санкцыях, і прапановы, якія ў працэсе работы ўрада паступілі ад дзяржорганаў, прадпрыемстваў, аблвыканкамаў, грамадства. Прэзідэнтам даручана імплементаваць гэтыя рашэнні ў эканамічнае асяроддзе».

Па словах спікера, змены закрануць такія сферы, як закупка, лагістыка, разлікі, рэгуляторыка. То-бок тое, з чаго складаецца працэс стварэння прадукту.

«Па кожным з іх мы будзем прапаноўваць паслабленні. Гэта датычыцца і арэнды, і разлікаў, і пэўных відаў падаткаў, і ўзаемадзеяння ў сертыфікацыі і маркіроўцы тавараў», — дадаў Мікалай Снапкоў.

Ён адзначыў, што прадпрыемствы любой формы ўласнасці сёння працуюць у аднолькава няпростай сітуацыі.

«І прадпрыемствы ўжо павінны былі адчуць пасыл, што ўрад, дзяржава, дзяржаўныя органы кіравання з'яўляюцца партнёрамі. Сёння мы казалі зноў пра тое, што нам неабходна яднацца і разам супрацьстаяць тым праблемам. Паўтару яшчэ раз, што гэта ў большай ступені магчымасці, што дазваляюць па-іншаму працаваць дзяржаўным органам і прадпрыемствам. Мы скарацілі мост паміж урадам і прадпрыемствамі. Работа ідзе фактычна напрамую і ў анлайн-рэжыме», — рэзюмаваў першы віцэ-прэм'ер.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### NYT: адзінства пазіцый ЗША, Еўропы і Украіны па расійска-ўкраінскім канфлікце дало трэшчыну

**Паміж ЗША, Еўропай і Украінай намеціліся сапраўдныя рознагалоссі наконт таго, якія мэты яны ставяць у канфлікце і якія меры трэба прыняць для яго вырашэння, паведамляе газета The New York Times.**

Выданне адзначае, што пасля трох месяцаў адзінства паміж саюзнікамі паступова пачынаюць узнікаць рознагалоссі наконт таго, што рабіць далей. У той час як ЗША называюць Расію краінай-ізгоем, якую неабходна адрэзаць ад сусветнай эканомікі, другія, у асноўным у Еўропе, папярэджваюць аб небяспецы такой ізаляцыі.

Францыя, Італія і Германія, найбуйнейшыя і вельмі багатыя краіны блока, асцерагаюцца, што канфлікт зацягнецца, і баяцца магчымага ўрону для ўласных эканомік. Гэтыя краіны лічаць Расію «непазбежным суседам», якога нельга ізаляваць назаўсёды. Венгрыя ў сваю чаргу адмовілася ад эмбарга на расійскую нафту.

У матэрыяле ўдакладняецца, што рознагалоссі найбольш адкрыта выявіліся на Сусветным эканамічным форуме ў Давосе, дзе былы дзяржсакратар ЗША Генры Кісінджэр выказаў меркаванне, што Украіне хутчэй за ўсё давядзецца адмовіцца ад часткі тэрыторыі ў ходзе перагавораў па ўрэгуляванні сітуацыі. Пры гэтым выданне задаецца пытаннем, ці адменяць ЗША і іх саюзнікі многія са сваіх разбуральных санкцый, калі Зяленскі згодзіцца на некаторыя ўступкі? Ці гэта разбурыць іх надзеі нанесці ўрон патэнцыялу Расіі ў будучыні?

### У ЗША пратэстоўцы запатрабавалі ў Кангрэса ўзмацніць кантроль над абаротам зброі

**У Вашынгтоне дзясяткі амерыканцаў прыйшлі да будынка Кангрэса, патрабуючы ад улад узмацніць кантроль над абаротам зброі ў Злучаных Штатах, паведамляе ТАСС.**

Член Сената ЗША Кірстэн Гілібранд, якая прыняла ўдзел у акцыі пратэсту, заявіла: амерыканскія ўлады не процістаяць зброевому лобі ў краіне і гэта ганьба для Кангрэса. «Абуральна, што яны не могуць процістаяць Нацыянальнай стралковай асацыяцыі і тым, хто хоча раздаваць зброю ўсім запар, калі хочаце і па якой хочаце прычыне», — заявіла яна.

24 мая старшакласнік Сальвадор Рамас адкрыў стральбу ў адной з пачатковых школ Тэхаса. Ён забіў 19 дзяцей і дзвюх настаўніц. Сам нападаючы загінуў пры затрыманні. Для ЗША інцыдэнты, аналагічныя таму, што здарыўся ў Тэхасе, не рэдкасць. Адной з прычын з'яўляецца даступнасць агнястрэльнай зброі ў краіне. Сёння многія амерыканскія грамадскія арганізацыі і радавыя грамадзяне выступаюць за абмежаванне доступу да зброі, аднак гэтага не адбываецца. Эксперты абвінавачваюць у такой сітуацыі зброевае лобі, якое паспяхова адстойвае свае камерцыйныя інтарэсы ў краіне.

### У Фінляндыі збіраюцца байкатаваць турэцкія шашлычныя на зло Эрдагану



**Дэпутат парламента Фінляндыі Міка Карна заклікаў да байкоту Турцыі ў сувязі з тым, што турэцкі ўрад не падтрымлівае ўступленне Фінляндыі і Швецыі ў НАТА да вырашэння пытання аб актыўнасці курдскіх актывістаў у гэтых краінах, паведамляе Middle East Monitor.**

«Я заклікаю грамадзян Фінляндыі не ездзіць у Турцыю ў водпускі, байкатаваць турэцкія шашлычныя і аўтамабілі турэцкай вытворчасці да таго часу, пакуль Турцыя не дасць згоду на членства Фінляндыі ў НАТА», — заявіў палітык.

Пры гэтым дэпутат указаў, што, нягледзячы на байкот шашлычных, купляць кебабы, якія робяць курды (а менавіта з-за курдскага пытання адбылося ахаладжэнне адносін скандынаўскіх краін і Турцыі) — нармальная практыка.

# ШАНЦЫ СТАЦЬ СТУДЭНТАМ ПАВЫШАЮЦЦА?




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## БЕЗ ЭКЗАМЕНАЎ І ПА-ЗА КОНКУРСАМ

— Кропкавыя змяненні, якія адбудуцца сёлета, датычацца дастаткова вузкага кола абітурыентаў, — расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ**. — Напрыклад, выпускнікі профільных спартыўна-педагагічных класаў змогуць паступаць без уступных іспытаў пры належным узроўні пасяховасці на профільныя спецыяльнасці ў галіне фізічнай культуры і спорту. Выпускнікі класаў ваенна-патрыятычнай накіраванасці змогуць паступаць ужо па крыху іншай ільгоце — гэта пазаконкурснае залічэнне на спецыяльнасці Ваеннай акадэміі, на ваенныя факультэты і ў Інстытут пагранічнай службы. У ВНУ Мінабароны змогуць пайсці тыя, хто вывучаў праграму факультатыву «Гатовы Радзіме служыць», у ВНУ Дзяржпагранкамітэта — факультатыву «Юны пагранічнік». Для абедзвюх катэгорый устаноўлена квота ў 30 працэнтаў ад лічбаў прыёму.

Без сертыфікатаў беларускага ЦТ змогуць паступаць і абітурыенты, якія здавалі Адзіны дзяржаўны экзамен у Расіі — у тым выпадку, калі яны паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, найбольш запатрабаваныя эканомікай. Гэта пэўнае кола спецыяльнасцяў, іх каля 30. Пералік перыядычна карэкціруецца па ўзгадненні з Міністэрствам эканомікі, у яго ўваходзяць спецыяльнасці ў першую чаргу рэальнага сектара эканомікі: сельскай гаспадаркі, лясной гаспадаркі, металургія лёгкай прамысловасці і іншыя. Прычым для такіх абітурыентаў устаноўлена квота ў 20 працэнтаў ад лічбаў прыёму.

У новых рэдакцыях Кодэкса аб адукацыі і Правілаў прыёму істотна пашыраюцца магчымасці мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў як формы дзяржаўнага заказу. Калі раней яна распаўсюджвалася толькі на пэўныя населеныя пункты (чарнобыльскія, сельскія рэгіёны, гарады з насельніцтвам да 20 тысяч), то цяпер такі дагавор можа заключыць арганізацыя — заказчык кадраў, якая знаходзіцца ў любым населеным пункце Беларусі, у тым ліку ў сталіцы. І вось менавіта гэта палажэнне ўступае ў сілу ўжо з гэтага года. Між іншым, магчымасць узяць мэтавае накіраванне ніяк не абмежавана месцам пражывання і прапіскі абітурыента. Так, абітурыент, які жыве ў Мінску, можа ўзяць мэтавае накіраванне ад арганізацый з Віцебскай ці Гродзенскай вобласці і пасля заканчэння вучобы ён будзе менавіта туды размеркаваны.

Усяго беларускія ВНУ плануюць прыняць сёлета на бюджэтную форму навучання каля 27,7 тысячы абітурыентаў. А на платную форму навучання план прыёму складае больш за 25 тысяч чалавек.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У структуры прыёму на бюджэт дамінуе дзённая форма навучання — яна складае больш за 80 працэнтаў ад лічбаў набору. А ў структуры прыёму на платную форму прасочваецца пэўны парытэт: прыкладна каля 50 працэнтаў складае прыём на дзённую форму навучання. Па словах Сяргея Каспяровіча, у параўнанні з папярэднім годам сёлета плануецца павелічэнне прыёму на бюджэтную форму навучання на медыцынскія спецыяльнасці, спецыяльнасці ў галіне тэхнікі і тэхналогіі і педагагічныя спецыяльнасці. Разам з тым скарэкціраваны прыём у бок памяншэння на незапатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці, у тым ліку на тыя напрамкі, дзе работадаўца аддае перавагу больш вопытным спецыялістам з рынку працы. Гэта эканоміка і юрыспрудэнцыя.

Прыём на ўзровень вышэйшай адукацыі пачнецца ў традыцыйныя тэрміны — 18 ліпеня. Усе этапы прыёмнай кампаніі захаваюцца. Інфармацыю аб прынятых нарматыўных актах абітурыенты і іншыя зацікаўленыя могуць атрымаць на сайце Міністэрства адукацыі. Таксама будзе традыцыйна працаваць «гарачая лінія» ведамства 8 (017) 222-43-12.

## МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце план прыёму на мэтавыя месцы вырас удвая ў параўнанні з папярэднім годам.

— Прычым размова ідзе не толькі пра традыцыйныя для мэтавай падрыхтоўкі спецыяльнасці: журналістыка, мытная справа, педагагічныя... Цяпер мы гаворым і аб праваназнаўстве, эканамічным праве, менеджменце з напрамкам «Менеджмент у міжнародным турызме», — расказаў **першы намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі БДУ Вячаслаў МАЛАФЕЕЎ**. — Гэта будзе мэтанакіраваная падрыхтоўка ў інтарэсах адпаведных ведамстваў. План прыёму на бюджэтную форму навучання ў БДУ сёлета крыху павялічыўся. На прыродазнаўча-навуковыя факультэты прыпадае 62 працэнты бюджэтных месцаў.

Заўважу, што ў БДУ адкрываюцца дзве прынцыпова новыя спецыяльнасці. Яны акумулююць работу, якую вялі ва ўніверсітэце некалькі факультэтаў. У прыватнасці, у адкрыцці спецыяльнасці «Біяінжынерыя і біяінфарматыка» ўдзельнічалі біялагічны факультэт, факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, фізічны факультэт і факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Атрымаўся сімбіёз чатырох факультэтаў. У выніку з'явілася вельмі важная спецыяльнасць, сарыентаваная на падрыхтоўку спецыялістаў у галіне біяінжынерыі. Яе адкрыццё абумоўлена адсутнасцю падрыхтоўкі спецыялістаў гэтага напрамку ў Беларусі і высокай запатрабаванасцю прафесіяналаў, якія адначасова валодаюць ведамі ў галіне агульнай біялогіі, геннай інжынерыі, оміксных тэхналогій, інфарматыкі, матэматыкі і статыстыкі.

На факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі створана новая спецыяльнасць «Геатэхналогіі турызму і экскурсійная дзейнасць». А на факультэце сацыякультурных камунікацый БДУ на спецыяльнасці «Дызайн» (па напрамках) адкрыецца новы напрамак «Дызайн касцюма і тканін».

## НА РУКАХ — ДА ПЯЦІ СЕРТЫФІКАТАЎ

Цяпер што датычыцца прыёмнай кампаніі 2023 года. У маі наступнага года ўсіх адзінаццацікласнікаў чакае абавязковы цэнтралізаваны экзамен (ЦЭ) па матэматыцы і адной з дзяржаўных моў на выбар.

Цэнтралізаваны экзамен будзе падобны на ЦТ. Школьнікаў арганізавана прывязуць у адзін са 100 пунктаў правядзення ЦЭ (забяспечыць падвоз павінны органы кіравання адукацыяй), ім раздадуць тэсты і лісты адказаў, а таксама пракантралююць, каб падчас здачы іспыту выконваліся ўсе правілы, як і падчас ЦТ. Распрацоўкай экзаменацыйных заданняў будзе займацца Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. Правяраць работы адзінаццацікласнікаў таксама будуць у інстытуце, як і работы ЦТ. Аб выніках іспыту максімальна аператыўна паведамяць школьнікам, бо атрыманыя на ЦЭ балы будуць улічвацца пры выстаўленні ў атэстат выніковай адзнакі па адпаведным прадмеце.

Як запэўнівае Сяргей Каспяровіч, цэнтралізаваны экзамен будзе лічыцца здадзеным незалежна ад колькасці набраных балаў, і адзнаку ў школьны атэстат выпускнік атрымае з улікам гадавой адзнакі і сваёй пасяховасці. Пры гэтым, калі казаць аб паступленні ў ВНУ, там парогі балаў захаваюцца. Напрыклад, на сённяшні ЦТ па матэматыцы, калі гэта першы профільны прадмет, трэба здаць на 20 балаў і больш, калі другі — не менш як на 10 балаў.

Выпускнікам, якія збіраюцца паступаць у ВНУ, выдадуць сертыфікаты ЦЭ з іх баламі. Таксама выпускнікі адзінаццатых класаў змогуць здаць цэнтралізаванае тэсціраванне па любых прадметах, якія не здавалі на цэнтралізаваным экзамене: гэта фізіка, хімія, біялогія, гісторыя, замежная мова і г. д. Калі на цэнтралізаваным экзамене здавалася руская мова, на ЦТ можна будзе здаць беларускую і наадварот. У выніку пры паступленні ў абітурыента на руках можа аказацца да пяці сертыфікатаў: тры сертыфікаты ЦТ плюс два сертыфікаты цэнтралізаванага экзамену.

— Гэта забяспечыць маладым людзям шырокі выбар спецыяльнасцяў, — лічыць Сяргей Каспяровіч. — Галоўнае — паставіцца сур'ёзна да прафесійнага выбару...

Новаўвядзенне, удакладніў Сяргей Каспяровіч, не закране выпускнікоў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных устаноў, якія паралельна з прафесіяй атрымліваюць і сярэднюю адукацыю: яны, калі захочуць прадоўжыць навучанне, павінны будуць здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне.

Дзейнічаць сертыфікаты цэнтралізаванага экзамену будуць два гады. Яшчэ адзін важны нюанс: выпускнікі 2023 года, незадаволеныя баламі ў сертыфікаце ЦЭ па матэматыцы і дзяржаўнай мове, у 2024 годзе змогуць здаць гэтыя прадметы ўжо на ЦТ. Гэта дазваляецца рабіць усе наступныя гады, толькі не ў год заканчэння школы.

## У ВНУ — ПРАЗ АЛІМПІЯДУ

Таксама ў 2023 годзе з'явіцца вельмі магутны прафарыентацыйны фактар — ўніверсітэцкія алімпіяды, якія аўтаматычна адкрываюць дарогу ў ВНУ.

Як расказаў Сяргей Каспяровіч, заданні на такіх алімпіядах будуць знаходзіцца «ў рамках школьных прадметаў», але з уключэннем творчых або звязаных са спецыфікай ВНУ элементаў.

Пераможцы ўніверсітэцкіх алімпіяд без уступных іспытаў змогуць паступіць у тую ВНУ, якая праводзіла спаборніцтвы, на асобныя спецыяльнасці (іх спіс сфарміруюць загадзя).

— Заўважу, што алімпіяда прывязана да канкрэтнай ВНУ. Рэспубліканскія школьныя алімпіяды таксама застануцца. Проста цяпер у абітурыентаў з'яўляецца дадатковая магчымасць трапіць у ВНУ без экзаменаў праз універсітэцкія спаборніцтвы, — дадаў Сяргей Каспяровіч.

З 2023 года паступленне ў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь будзе ажыццяўляцца па асаблівым парадку. Гэта ўстанова зоймецца рэалізацыяй адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі на павышаным узроўні, яе паспяховае асваенне дасць магчымасць абітурыентам паступіць у акадэмію без уступных іспытаў.

На завочную бюджэтную форму атрымання адукацыі з наступнага года стануць прымаць толькі абітурыентаў з 10-месячным працоўным стажам. Гэта значыць, што паступіць на завочную форму ў год заканчэння школы не атрымаецца. Акрамя таго, выпускнікі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка пры наяўнасці рэкамендацый Назіральнага савета ўстановы змогуць паступіць па выніках гутаркі, без здачы ЦТ, на тэхніка-тэхналагічныя навуковыя спецыяльнасці ў адпаведныя ВНУ.

У 2023 годзе ў сілу ўвойдуць нормы аб павелічэнні ва ўстановах вышэйшай адукацыі гранічных квот у рамках мэтавай падрыхтоўкі: па сельскагаспадарчых спецыяльнасцях — да 70 працэнтаў ад кантрольных лічбаў прыёму, па медыцынскіх — да 80 працэнтаў і па іншых — да 60 працэнтаў.

Трэба разумець, што 60, 70 і 80 працэнтаў — гэта максімальная планка. І тут ёсць шмат акалічнасцяў. Ці знойдзецца столькі заказчыкаў, гатовых пралічыць свае патрэбы ў кадрах на 4-5 і больш гадоў наперад? Ці будуць гатовыя абітурыенты заключаць дагавор на мэтавую падрыхтоўку? Сёння такія дагаворы заключаюцца на пяць гадоў адпрацоўкі на заказчыка кадраў пасля атрымання вышэйшай адукацыі і на тры гады — пасля атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

На медыцынскіх спецыяльнасцях дастатковая колькасць заказчыкаў кадраў, хутчэй за ўсё, знойдзецца. Пры такім раскладзе за звычайны конкурс для ахвотных паступіць на бюджэт месцаў застанецца менш, таму што мэтавыя месцы — гэта бюджэтныя месцы. І абітурыентам, каб павысіць свае шанцы на паступленне, давядзецца рабіць выбар на карысць мэтавай падрыхтоўкі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Будзь у курсе!

## ШТО ТРЭБА ЗРАБІЦЬ АБІТУРЫЕНТАМ ДА 1 ЧЭРВЕНЯ?

### Зарэгістравацца на ЦТ і забраць свае пропускі...

**У першы дзень лета завяршаецца рэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў ЦТ. Папярэдняя анлайн-рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне будзе даступная толькі да 12 гадзін 1 чэрвеня. А пасля 12 гадзін і да закрыцця пунктаў рэгістрацыі ў 19 гадзін падаць заяву на ўдзел у ЦТ можна будзе толькі асабіста, завітаўшы ў адзін з пунктаў рэгістрацыі.**

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў нагадваюць, што працэс рэгістрацыі для ўдзелу ў ЦТ лічыцца завершаным толькі пасля атрымання абітурыентам пропуска.

**Прыйсці па пропуск трэба не пазней за 1 чэрвеня.** Пры анлайн-рэгістрацыі ў графе «Абраныя прадметы і пункты тэсціравання» ўказваюцца адрасы пунктаў рэгістрацыі, у адзін з якіх неабходна звярнуцца пасля здзяйснення аплаты. Пры сабе трэба мець пашпарт або від на жыхарства, пасведчанне бежанца. Забраць пропускі замест абітурыента могуць таксама яго законныя прадстаўнікі.

Менавіта ў пропуску ўказваецца інфармацыя, калі і куды трэба прыходзіць у дзень правядзення тэсціравання. Пропуск для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні лічыцца зарэгістраваным, калі на ім маецца пячатка ўстановы, вызначанай пунктам правядзення ЦТ, подпіс упаўнаважанага прадстаўніка пункта рэгістрацыі і рэгістрацыйны нумар. У выпадку страты пропуску выдаецца дублікат.

Абітурыентам дазваляецца зарэгістравацца не больш як на чатыры дысцыпліны. Пры жаданні можна памяняць прадметы для здачы на ЦТ. Да атрымання пропускаў у асабістым кабінеце можна змяніць даныя ў заяве: набор прадметаў, мову тэста і г. д. Калі з'явілася неабходнасць гэта зрабіць ужо пасля атрымання пропуску, трэба звяртацца ў пункт ЦТ асабіста. Аднак усе маніпуляцыі можна будзе зрабіць толькі да 1 чэрвеня (уключна).

Выбар мовы, на якой абітурыент жадае здаваць тэсты, ажыццяўляецца яшчэ на этапе падачы заявы і рэгістрацыі на ЦТ. Заява запаўняецца ўдзельнікам ЦТ на адной з дзвюх дзяржаўных моў — беларускай ці рускай на выбар. Трэба мець на ўвазе, што пазней зона рэгістрацыі бланка адказаў будзе запаўняцца абітурыентам на той жа мове, на якой была пададзена заява пры рэгістрацыі. І сертыфікат удзельніка ЦТ будзе запаўняцца таксама на той мове, на якой падавалася заява.

Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе 14 чэрвеня з беларускай мовы. Самымі масавымі выпрабаваннямі традыцыйна будуць ЦТ па матэматыцы і рускай мове.

Да сустрэчы, Полацк!

# СВЯТА, БАГАТАЕ НА ЎРАЖАННІ

**Днямі сваё 1160-годдзе адзначыў горад Полацк. З даўніх часоў і да сёння гэтая зямля была і застаецца калыскай беларускай культуры, духоўнасці і дзяржаўнасці. Свята палачане і госці адзначылі з размахам і ў найлепшых традыцыях.**




Як адзначыў у прывітальным адрасе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, «...горад свята захоўвае сваю багатую шматвяковую спадчыну, прыцягваючы бясконцы паток турыстаў і паломнікаў з Беларусі і замежжа... Цяперашнія палачане вартыя сваіх дзіўных продкаў. Чыстыя вуліцы і квітнеючыя зялёныя двары, маляўнічыя фасады і багацце малых архітэктурных формаў, паспяховая праца дзяржаўных і прыватных прадпрыемстваў красамоўна сведчаць аб стаўленні да роднага горада...»



І пераканацца ў тым маглі ўсе наведвальнікі свята. Арганізатары падрыхтавалі яркую і насычаную праграму, з якой кожны мог выбраць нешта на свой густ. Так, можна было пакаштаваць прыгатаваныя па старажытных рэцэптах хлеб, напоі, мяса і іншыя адметныя стравы. Прычым не толькі падсілкавацца, але і распытаць у знаўцаў пра адметнасці працэсу. Такія вось кулінарныя вандроўкі. Была магчымасць убачыць творчасць тых майстроў, хто сёння на славутай зямлі захоўвае сакрэты вырабу розных прадметаў сваімі рукамі: тут ткуць, лепяць з гліны, плятуць з лазы, саломкі і робяць шмат прыгажосці, у якой адчуваецца не толькі майстэрства, але і душа і любоў іх стваральнікаў.

Таксама для гараджан і гасцей свята працавалі інтэрактыўныя пляцоўкі, пасля наведвання якіх кожнаму былі гарантаваны добры настрой і незабыўныя ўражанні. Прайсці крос-фіт ці зрабіць памятныя сэлфі на фоне байкаў, а можа, праз гульню паўтарыць правілы бяспекі на любы выпадак жыцця альбо пакатацца на атракцыёнах — тут выбар быў шырокі.

Адметнай падзеяй святкавання стала тое, што ў гэты знамянальны дзень Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава была ўдастоена звання пачэснага грамадзяніна Полацкага раёна. Спікера адзначылі такой узнагародай за значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Полацка, захаванне і прымнажэнне нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванне ў моладзі патрыятызму і любові да Радзімы, умацаванне духоўных каштоўнасцяў, актыўную грамадскую дзейнасць у Беларускім саюзе жанчын па павышэнні ролі жанчын у працэсах кіравання дзяржавай.





«Для мяне гэта вельмі высокая ўзнагарода, і я бязмерна шчаслівая, што знаходжуся сёння тут. Я вельмі люблю свой горад і заўсёды ганарылася тым, што я палачанка. Для мяне гэта найлепшы горад на зямлі, як і для кожнага з нас малая радзіма. Ён у маім сэрцы. Гэта мая духоўная сіла, тое месца, дзе я, прыязджаючы, удыхаю на поўныя грудзі, адчуваючы цеплыню роднай хаты, сваіх любімых землякоў», — сказала Наталля Качанава.

А ў тым, што ў Полацку жывуць сапраўды таленавітыя, працавітыя людзі, якія ўмеюць радавацца таму, што маюць, берагчы сваю зямлю і яе гісторыю, у дні святкавання юбілею горада пераканаліся ўсе. Свята прайшло, а вось пачуццё, што працяг будзе, засталося. Таму што любоў да свайго — тая стваральная сіла, якая дае жыццё на гады і тысячагоддзі.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота БелТА.**

Надвор'е

## НА СТАРЦЕ ЛЕТА СТАНЕ ЦЯПЛЕЙ

### Але сіноптыкі абяцаюць, што будзе дажджліва



**Апошнія дні мая прынясуць няўстойлівае і адносна халоднае надвор'е. На гэтым тыдні будуць ісці кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі і парывістым ветрам, а сярэднясутачная тэмпература паветра па-ранейшаму будзе знаходзіцца ніжэй за сярэднія шматгадовыя значэнні, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А ў аўторак у дзённыя гадзіны ў асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Максімальная тэмпература ўдзень складзе плюс 16—22 градусы. У першыя суткі лета ўначы будзе пераважна без ападкаў. Раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца дажджы, а ў асобных раёнах навальніцы і моцныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5—12 градусаў, а днём — ад плюс 19 градусаў да 26 цяпла, на крайнім паўднёвым захадзе слупок тэрмометра падымецца да плюс 17—18 градусаў.

Чакаецца, што ў чацвер будзе яшчэ цяплей. У гэты дзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах — навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 7—14 градусаў, днём — ад плюс 17 градусаў да 24 цяпла, а па ўсходзе — плюс 25—27 градусаў. У пятніцу ўначы на большай частцы тэрыторыі краіны, а днём месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад 8 да 14 градусаў цяпла, а ўдзень — ад 17 да 24 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у суботу ўначы пераважна без ападкаў, а раніцай і днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—12 цяпла, а днём ад плюс 17 градусаў да 24 градусаў. На поўдні ў гэты дзень будзе на пару градусаў цяплей.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Узровень

# «ТЭЛЕВЯРШЫНЯ» ЗНОЎ УРУЧАЕ ЎЗНАГАРОДЫ!

## Гран-пры ў праекта «Х-фактар. Суперфінал»



**Пасля перапынку ў пяць гадоў зноў пачаў сваю работу Нацыянальны тэлевізійны конкурс «Тэлевяршыня». Сёлета ён адбыўся 14-ы раз. У склад сяброў журы ўвайшлі вядомыя культурныя дзеячы Беларусі. Сярод іх — рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля Карчэўская, народны артыст Беларусі Аляксандр Яфрэмаў, прафесар кафедры тэлебачання і радыёвяшчання факультэта журналістыкі БДУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вячаслаў Булацкі і іншыя.**

Падчас урачыстай цырымоніі абвяшчэння вынікаў «Тэлевяршыні» кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар Сергеенка засяродзіў увагу на тым, што тэлежурналістыка перажывае новы этап свайго развіцця ва ўмовах інфармацыйнай вайны, выклікаў і пагроз:

— Фактычна на працягу апошняга часу вы мужна, самаахвярна працуеце ў эфіры, ствараеце новыя праграмы. З'яўляюцца новыя патрыятычныя асобы. Правядзенне конкурсу «Тэлевяршыня», падвядзенне вынікаў, уручэнне ўзнагарод — знакавая і доўгачаканая падзея для журналістаў, вядучых, гукааператараў, рэжысёраў — усіх тых, хто стварае праграмы, фарміруе новыя ідэі, дорыць нам радасць. Для кожнага чалавека, які працуе ў кадры, важная любоў гледача, ацэнка глядацкай аўдыторыі, але не менш важная ацэнка калег па цэху. Гэта пэўны шлях да вяршыні вашых творчых прафесій.

Ігар Сергеенка абвясціў прывітальны адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. У ім кіраўнік краіны адзначыў, што дзякуючы таленавітым журналістам, іх майстэрству і імкненню да дасканаласці беларускае тэлебачанне набыло пазнавальны і непаўторны стыль. Сапраўдным адкрыццём стала айчынная аўтарская журналістыка — хлёсткая і дынамічная, якая перакана́ўча адказвае на інфармацыйныя выклікі нашага часу.

Першыя ўзнагароды Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу атрымалі супрацоўнікі рэгіянальных медыя.

У намінацыі «Найлепшы рэгіянальны тэлевізійны праект» пераможцам стаў **праект «Брэсцкая крэпасць»**.

Найлепшай вядучай рэгіянальнага тэлебачання стала **Капіталіна Зінкевіч**.

Узнагароду найлепшага журналіста рэгіянальнага тэлебачання атрымаў **Сяргей Пеклін**.

У наступную катэгорыю, адзначаную статуэткамі «Тэлевяршыні», увайшлі айчынныя тэлепраграмы.

Найлепшай ранішняй інфармацыйна-забаўляльнай тэлепраграмай стала **«Наша раніца»**.

У намінацыі «Найлепшая культурна-асветніцкая тэлепраграма» адзначылі **«Жывую спадчыну»**.

Праект тэлеканала Беларусь-3 **«Вечары з сімфанічным аркестрам «Рэха вайны»** перамог у катэгорыі «Музычны забаўляльны праект».

У катэгорыі «Спартыўны праект» найлепшай стала праграма тэлеканала Беларусь-5 **«Алімпійская раніца»**.

Намінацыя «Дзіцячая, юнацкая праграма» скарылася праграме **«Я ведаю»**.

Найлепшай у катэгорыі «Расследавальніцкая журналістыка» стала **серыя расследаванняў Другога нацыянальнага канала**.

У намінацыі «Ток-шоу» статуэтку атрымала перадача **«Клуб рэдактараў»** канала Беларусь-1.

**«P.S. Пастскрыптум»** атрымала статуэтку ў катэгорыі «Найлепшая грамадска-палітычная, публіцыстычная праграма».

Пераможцай у намінацыі «Выніковая тэлепраграма» стаў **«Галоўны эфір»**.

У катэгорыі «Праграма-інтэрв'ю» адзначылі **«Скажинемолчи»** тэлеканала Беларусь-1.

Найлепшым дакументальна-тэлевізійным праектам абвясцілі праект **«ЧАЭС 35. Горыч палыну»**.

А сярод інфармацыйных праграм перамаглі **«Нашы навіны»**.

Падчас цырымоніі ўручэння ўзнагарод Нацыянальнага конкурсу «Тэлевяршыня» былі адзначаны і персаналіі.

Прыз за рэжысуру атрымала **каманда XII Нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь»**.

Пераможцай у намінацыі «Вядучы інфармацыйнай праграмы» стала **Паліна Шуба**, тэлеперадача «Панарама».

Найлепшы рэпарцёр — **Ксенія Лебедзева**, Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі.

**Грыгорый Азаронак** атрымаў статуэтку як найлепшы вядучы грамадска-палітычнай, публіцыстычнай праграмы.

**Ігару Туру** ўручылі ўзнагароду за найлепшую аўтарскую тэлепраграму.

У намінацыі «Аўтарскі блог на тэлебачанні» перамагла **Марыя Пятрашка**.

Пераможцай XIV Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу «Тэлевяршыня» ў галоўнай намінацыі «Праект года» стаў **«Х-фактар. Суперфінал. Прамы эфір»**.

Таксама ў гэтым годзе была ўведзена новая намінацыя — «Адзіны фронт». Спецыяльныя прызы былі ўручаны **журналістам, якія працавалі на беларуска-польскай граніцы ў лагеры для бежанцаў**.

Арганізатарамі Нацыянальнага конкурсу «Тэлевяршыня» выступаюць Міністэрства інфармацыі, Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь, ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» і ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне».

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота БелТА.**

# ВАЛОШКАВАЕ ЗАКУЛІССЕ




**Праз паўтара месяца паўночная сталіца Беларусі напоўніцца гукамі чароўнай музыкі, духам творчасці і звонкім смехам. Ужо 13 ліпеня расчыніць свае дзверы XXXI Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».**

Мы даведаліся аб сакрэтах і новых формах фестывалю, нюансах падрыхтоўкі і вялікім зладжаным калектыве, які стаіць за ўрачыстасцю і маштабнасцю «Славянкі».

### НЕРЭАЛЬНА, АЛЕ ФАКТ

Сёлета знакаміты фестываль пройдзе 31-ы раз, нават у мінулым годзе, калі з-за пандэміі ў свеце масава адмянялі канцэрты і буйныя мерапрыемствы, «Славянскі базар» не спыніўся на шляху адоравання людзей музыкай і дабрынёй, гэта своеасаблівы рэкорд. Было цяжка, арганізатарам прыходзілася мяняць праграму ў апошні месяц перад адкрыццём... Але зладжанасць каманды пераадолела нават закрытыя для транспартных камунікацый мяжы: падчас «Базару» ў пазамінулым годзе па маршруце Віцебск — Масква курсіраваў цягнік з артыстамі. Канешне, усе мерапрыемствы прайшлі з выкананнем санітарных нормаў, урачы бралі ПЛР-тэсты адразу ў грымёрках і гасцініцах. Мінулы год яшчэ раз пацвердзіў абраны фестывалем дэвіз «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення!»

«У гэтым годзе, дзякуючы бязвізаваму рэжыму, да нас прыедуць госці з блізкага і далёкага замежжа, для якіх «Славянскі базар» стаў сімвалам адзінства і натхнення, з якім яны сталелі», — адзначыў **дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў Глеб ЛАПІЦКІ**.

### ЗАПАЛЬВАЕМ ЗОРКІ

Асаблівы акцэнт гэтага года — юбілейная тэматыка. Яна чырвонай стужкай праходзіць праз форум з канцэпцыяй 30+1. Разынкай святочнай праграмы стане XX Міжнародны дзіцячы музычны конкурс «Віцебск-2022», які стаў прафесійным трамплінам для шматлікіх зорак эстрады. Сёлета на віцебскай сцэне будзе выступаць і хлопчык з Мексікі. Упершыню ў 2022 годзе найбольш таленавітаму і яркаму канкурсанту будзе ўручана прэмія Ігара Лучанка, а прызавы фонд Гран-пры складае пяць тысяч долараў.

На XXXI Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2022» артысты прадставяць свае музычныя творы ў двух адздяленнях: песня на адной са славянскіх моў у суправаджэнні аркестра і сусветны хіт з падтанцоўкай шоу-балета «Todes». Цікава, што паміж конкурснымі выступленнямі ўдзельнікаў вітаць жыхароў і гасцей Віцебска будуць заслужаныя артысты: Ларыса Доліна, Анатоль Ярмоленка, Ігар Нікалаеў і іншыя. Дарэчы, шоу-балет рыхтуе пастаноўку нумара без канкурсанта, і выканаўца з танцорамі перад выступленнем мае магчымасць толькі адзін раз правесці рэпетыцыю на сцэне летняга амфітэатра. Асаблівай увагі заслугоўвае працэс лёсавання: кожны год арганізатары прыдумваюць цэлую тэатральную замалёўку для ўдзельнікаў.

«У мінулым годзе лёсаванне праводзілі на сядзібе Ільі Рэпіна ў Здраўнёве праз вобразы гліняных збанкоў, а ў гэтым, магчыма, звяжам з колам агляду, якое зусім нядаўна стала гарадской славутасцю», — падзялілася планамі **намеснік генеральнага дырэктара па спецыяльных праектах, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Марына РАМАНОЎСКАЯ**.

### НОВЫ ФАРМАТ

Нягледзячы на тое што ў ліпеньскіх канцэртных праграмах рэгулярна мільгаюць модныя артысты, у гэтым годзе арганізатары ствараюць новую маладзёжную пляцоўку open-air каля канцэртнай залы «Віцебск». Для наведвальнікаў канцэрта электроннай музыкі з удзелам знакамітых DJi «Рытмаў лета» будзе поўная свабода рухаў для танцаў — на гэтай пляцоўцы не прадугледжаны сядзячыя месцы.

Ужо ўпадабаная гледачамі ўверцюра да фестывалю будзе запрашаць на феерыю «Гэты чароўны цырк», для чаго будуць створаны незвычайныя дэкарацыі, а сцэна ператворыцца ў каляровую арэну. Якой яна будзе — застаецца сакрэтам, але за прыгожай карцінкай стаіць творчая і фізічная работа вялікай каманды.

Навінкай стане праект з Расійскім інстытутам тэатральнага мастацтва «Тэатральная лабараторыя», у якой нашы студэнты-акцёры будуць пераймаць вопыт у выкладчыкаў з Расіі і замежных тэатральных труп.

### КВІТОК, А НА ІМ — ВАЛОШКА

Гарачая пара ў білетных касах Цэнтра культуры «Віцебск» пачалася яшчэ ў пачатку мая, чэргі і зараз выстройваюцца. Квіткі на мерапрыемствы з'явіліся ў продажы ў лютым, але, як заўсёды, спачатку арганізатары не раскрывалі імёны артыстаў. Сёння квіткі актыўна раскупляюць на ўрачыстае адкрыццё, «Шансон-ТБ», конкурс выканаўцаў эстраднай песні, «Залаты хіт», творчы вечар Сяргея Бязрукава і іншыя. Краіны Прыбалтыкі і блізкага замежжа браніруюць квіткі для цэлых калектываў. Дарэчы, юрыдычным асобам на канцэрты ў амфітэатры пры пакупцы ад 100 білетаў дзейнічае зніжка 10 працэнтаў. Прыемны падарунак моладзі да 31-га фестывалю зрабілі арганізатары: на мерапрыемствы ў фармаце open-air квіток у першай тысячы каштуе ўсяго 31 рубель. Пасля будзе вышэй.



«У сувязі з бязвізавым рэжымам людзі вельмі ажывіліся. Тыя, хто прапусціў некалькі фестываляў, хочуць прыехаць у ліпені. Ажыятаж вельмі вялікі, ужо прададзена больш за 30 працэнтаў ад агульнай колькасці білетаў. Набыць квіткі можна анлайн на сайтах ticketpro.by, kvitki.by», — адзначыла **загадчыца білетнай касы Цэнтр культуры «Віцебск» Ала ДВАРЭЦКАЯ**.

### ДУША ГОРАДА НА ДЗВІНЕ

Будзе няправільным разважаць, што «Славянскі базар у Віцебску» — толькі канцэрты на розных пляцоўках. Гэта час, калі горад ажывае, напаўняецца мільёнамі галасоў і красак. «Фестываль — душа горада. Атмасфера, што пануе тут, не падобная ні на адну іншую. Мы ўкладваем матэрыяльныя і творчыя рэсурсы ў інфраструктуру горада з дапамогай улады і спонсараў, супрацоўнічаем з дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі ўсіх краін», — расказаў Глеб Лапіцкі.

«Славянка» — гэта фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах», горад майстроў, падворкі і разнастайныя пляцоўкі, чатыры дні Саюзнай дзяржавы... А яшчэ — свята натхнення, творчасці і адзінства.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**

*Поўную праграму мерапрыемстваў фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» глядзіце на сайце zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. УНП 191021390** |
| **Продавец** | **ОАО «Мозырский спиртоводочный завод», Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с, 15/93 (тел. +375 236 209 222) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 118-10Б/2016** |
| **Антикризисный управляющий** | **ООО «СтанИБор», УНП 491343813, г. Гомель, ул. Жарковского, 24, к. 3-7, тел. +375 (29) 835-67-42** |

**Предмет аукциона, назначенного на 04.07.2022**
**Недвижимость**
(назначение – здания специализированные автомобильного транспорта)
**Местонахождения: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Котловца М. П.**

| Наименование (назначение) | Общ. пл., кв. м | Инв. номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Индивидуальный капитальный гараж** | 48,7 | 330/С-36320 | 9Б |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0059 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 21.01.2032) для строительства и обслуживание индивид. капит. гаража | | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 21 360,00 бел. руб. Шаг аукциона – 1 068,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Индивидуальный капитальный гараж** | 24,6 | 330/С-36321 | 9В |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0029 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 21.01.2032) для строительства и обслуживание индивид. капит. гаража | | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 11 160,00 бел. руб. Шаг аукциона – 558,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Индивидуальный капитальный гараж** | 24,8 | 330/С-36322 | 9Г |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0029 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 21.01.2032) для строительства и обслуживание индивид. капит. гаража | | | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 1 0680,00 бел. руб. Шаг аукциона – 534,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 4** | | | |
| **Индивидуальный капитальный гараж** | 24,5 | 330/С-36323 | 9Д |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0029 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 21.01.2032) для строительства и обслуживание индивид. капит. гаража | | | |
| **Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 12 480,00 бел. руб. Шаг аукциона – 624,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 5** | | | |
| **Индивидуальный капитальный гараж** | 24,9 | 330/С-36324 | 9Е |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0029 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 21.01.2032) для строительства и обслуживание индивид. капит. гаража. | | | |
| **Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 10 800,00 бел. руб. Шаг аукциона – 540,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 6** | | | |
| **Индивидуальный капитальный гараж** | 24 | 330/С-36325 | 9Ж |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0030 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 21.01.2032) для строительства и обслуживание индивид. капит. гаража | | | |
| **Начальная цена лота № 6 с НДС 20 % – 10 920,00 бел. руб. Шаг аукциона – 546,00 бел. руб.** | | | |

**Аукцион по лотам №№ 1–6 состоится 04.07.2022** в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы, в т.ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 31.05.2022 по 30.06.2022**до 17.00 по указанному адресу

**Предмет повторного аукциона, назначенного на 16.06.2022**
**Лоты №№ 7-22 – оборудование и транспортные средства, бывшие в употреблении**
**Местонахождение: Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с**

| № лота | Инв. № | Наименование объекта | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 7 | 4216010 | **Сверлильный станок** | **810,00** | 40,50 |
| 8 | 4216014 | **Станок ВП ЗД** | **529,20** | 26,46 |
| 9 | 0116007 | **Контейнер для хранения топлива** | **2376,00** | 118,80 |
| 10 | 0216002 | **Автозаправочный пункт** | **1296,00** | 64,80 |
| 11 | 0216001 | **Автозаправочный пункт** | **1296,00** | 64,80 |
| 12 | 4116045 | **Экскаватор ЮМЗ** | **2592,00** | 129,60 |
| 13 | 0516111 | **Автомобиль самосвал ГАЗ-53, гос. № 42 17-3** | **2376,00** | 118,80 |
| 14 | 0516230 | **Автомобиль ГАЗ-33023, гос. № 90 79** | **2700,00** | 135,00 |
| 15 | 0516126 | **Автомобиль ГАЗ-53, гос. № 44 17** | **1512,00** | 75,60 |
| 16 | 0516123 | **Автобус Икарус, гос. № 01 55** | **5400,00** | 270,00 |
| 17 | 0516210 | **Автомобиль ГАЗ-33021, гос. № А 6921-3** | **2484,00** | 124,20 |
| 18 | 0516185 | **Автомобиль КО-713 на базе ЗИЛ-130, гос. № 37 52** | **5076,00** | 253,80 |
| 19 | 0516228 | **Автомобиль ГАЗ 2705200 (груз. фургон) гос. № 89 31** | **1296,00** | 64,80 |
| 20 | 0516236 | **Автомобиль МАЗ 533605-221 грузовой бортовой, гос. № АВ 1634-3** | **4320,00** | 216,00 |
| 21 | 0516244 | **Прицеп тентовый бортовой KESSBOHRER VC14 L, гос. № 1553 А-3** | **2700,00** | 135,00 |
| 22 | 0516186 | **Автомобиль ГАЗ-66, гос. № 41-80** | **3240,00** | 162,00 |

**Лот № 23 – недвижимость**
**Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с, 15/103**

| | | |
|---|---|---|
| **Здание пожарное депо на 4 автомашины** (здание нежилое). Составные части и принадлежности: гаражи, пристройка, навес, бетонная площадка | 1511,8 кв. м | 330/С-12151 |

**Начальная цена лота № 23 с НДС 20 % – 176 040,00 бел. руб.**
**Шаг аукциона – 8 802,00 бел. руб.**

Цены по лотам №№ снижены на 10 %

Извещение о проведении предыдущего аукциона по лотам № № 7–23 опубликовано в в ЕГРСоБ 06.04.2022 и газете «Звязда» 05.04.2022

**Аукцион по лотам №№ 7–23 состоится 16.06.2022** в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы, в т.ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 31.05.2022 по 15.06.2022** до 17.00 по указанному адресу

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Урвачева С.П., тел. +375 29 805-93-30 |

***Условия самовывоза и демонтажа оборудования:*** демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона. **После проведения аукционов, назначенных на 16.06.2022 и 04.07.2022, Продавец уполномочивает покупателя, в установленном законодательством порядке, обратиться за осуществлением регистрационных действий в отношении земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона и произвести государственную регистрацию договора купли-продажи. Расходы по оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона несутся покупателем**

Лица, желающие принять участие в аукционе обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток по лотам 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».**
Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок, указанный выше, заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 выше указанного Закона. Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.
Порядок оформления результатов торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5 (пять)** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | **не позднее 5 (пять)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи |

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение от 1 % до 10 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Контактные телефоны: +375 17 280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29** |

**Предмет аукциона:**

**Лот № 1 –** офис (административное помещение) общей площадью 15,6 кв. м, инв. номер 200/D-193558, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 6

**Начальная цена с НДС 20 % – 36 828,00 бел. руб.**
**(снижена на 10 %)**

**Лот № 2** – **офис** (административное помещение) общей площадью 115,6 кв. м, инв. номер 200/D-193559, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 7.
**Условие аукциона:** при приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона (кондиционер Mitsubishi FDCV A302HENR (наружный блок) (инвентарный номер 50043395)), на сумму 926,36 бел. руб. с НДС 20 %

**Начальная цена с НДС 20 %** – **262 200,00 бел. руб.**
**(снижена на 5 %)**

**Лот № 3 – кафе** (помещение общественного питания) общей площадью 114,4 кв. м, инв. номер 200/D-193567, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 14.

**Начальная цена с НДС 20 %** – **258 780,00 бел. руб.**
**(снижена на 5 %)**

**Обременение по лотам 1–3:**
**1.** Аренда. Подробная информация у Продавца.
**2.** Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 10 рабочих дней после проведения аукциона (по лоту № 1) не позднее 5 рабочих дней после проведения аукциона (по лотам № 2–3).
**Срок оплаты:** не позднее 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи (по лоту № 1) не позднее 5 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи (по лотам № 2–3).
Передача предмета аукциона осуществляется не позднее 5 рабочих дней (по лоту №1) и 3 рабочих дней (по лотам № 2–3) после полной оплаты покупателем стоимости предмета аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона), обратиться за государственной регистрацией перехода прав на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.05.2022 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **15.06.2022 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **13.06.2022 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 22 июня 2022 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 85 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **Информация о земельном участке: лот № 1–2** расположены на земельном участке с кадастровым номером **324550100001001409** общей площадью **1,2046 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Чапаева, 108. **Условие продажи (лот № 1–2):** после проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя, в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на покупателя. В связи с обеспечением возможности для каждого из образованных в результате раздела (выделения, деления) земельных участков беспрепятственных подъездов (подходов) для организации доступа к ним с целью содержания и обслуживания покупателями приобретенных зданий и сооружений в соответствии со ст. 268 ГК Республики Беларусь, ст.ст.19,45 «Кодекса Республики Беларусь о земле», установить право ограниченного пользования чужим недвижимым имуществом (сервитут) на объекты недвижимости (земельные участки) через которые покупатели каждого из выставляемых на аукцион лотов после их приобретения имели бы доступ к ним с целью содержания и обслуживания приобретенных зданий и сооружений | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 340/С-315934** общей площадью **1 447,9** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание АБК** | **16 050,00** | 802,50 | 1 605,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 340/С-315933** общей площадью **571,6** кв. м, назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – **здание столовой** | **4 575,00** | 228,75 | 457,50 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 340/С-304011** общей площадью **638,9** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **мастерская ПМК-81. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324550100001013051** общей площадью **0,0737 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Чапаева, 108/11 | **4 020,00** | 201,00 | 402,00 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 340/С-304012** общей площадью **352,8** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **растворо-бетонный узел. Капитальное строение с инв. № 340/С-304009**, общей площадью **541,7** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **склад цемента. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324550100001013053** общей площадью **0,6649 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Чапаева, 108/3 | **3 645,00** | 182,25 | 364,50 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости – Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой**»): BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 31 мая 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 20 июня 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 18.01.2022 г. № 10 (29632).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

# «ДАПАМАЖЫЦЕ, БО НЯМА СІЛ ЦЯГАЦЬ ВЁДРЫ З ВАДОЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Не вельмі сяброўскія, мякка кажучы, адносіны склаліся ў жыхароў трохкватэрнага дома № 66, што на вуліцы Сацыялістычнай у Стоўбцах. Там, у кватэры № 1, жывуць сёстры-блізняты Альберта і Ганна Перэльман, якія і даслалі ліст у рэдакцыю. Жанчыны просяць дапамагчы ім атрымаць дазвол на пракладку сістэмы каналізацыі.

*«Мы жывём у кватэры № 1 з 1961 года, — сёстры распавядаюць сваю гісторыю па чарзе. — Калі нашы бацькі сюды засяліліся, у іншых кватэрах ужо жылі людзі. Дык яны паказалі месца, дзе мы можам штосьці пасадзіць. Тут было два агародзікі. З правага боку зямля раздзелена на тры кавалачкі і з левага боку — на тры. Так побач і рабілі кожны свае градкі, разам калодзежам карысталіся, у кожнага быў свой туалет на вуліцы. Наш — месціўся не за нашай кватэрай, а збоку кватэры № 3».*

*«Раней з суседзямі жылі дружна. Глядзіце, — Альберта Якаўлеўна паказвае фотаздымак, — не было ніякіх агароджаў. У 1996 годзе ў кватэру № 3 засялілася Мурукіна. З гэтага дня і пачаліся нашы пакуты, беды і хаджэнні па муках. У 2014 годзе яна падала ў Стаўбцоўскі суд іск аб вызначэнні парадку карыстання зямельным участкам. І абвінаваціла мяне ў тым, што як быццам бы я дзяліла зямлю і большую частку забрала сабе. Я ж вам казала, участак тут быў размеркаваны паміж трыма кватэрамі за шмат гадоў да нашага ўсялення. Ні я, ні сястра ніводнай травінкі чужой у жыцці не забралі. Мы з сястрой пражылі ў гэтым доме 60 гадоў. На старасці нас, адзінокіх, пажылых, хворых жанчын, пазбавілі ўсяго — вулічнага туалета, адрыны, агарода, калодзежа. Мала таго, што ўсё забралі, дык яшчэ і суд прысудзіў узяць з нас 4 679 700 рублёў (да дэнамінацыі. — Н. Д.) на карысць Мурукінай. Ад такой несправядлівасці ў нас з сястрой на нервовай глебе пачаліся праблемы з нагамі. Мы з цяжкасцю ходзім, трымаючыся за сценкі. Больш за тое, у выніку перадзелу нас пазбавілі пад'езду да выграбной ямы нашай каналізацыі».*

Яна знаходзіцца ў акружэнні зямлі, якую суд вызначыў у карыстанне жыхарам кватэры № 2. Сёстры Перэльман перажываюць, што каналізацыя перапоўніцца, і ў суседзяў, з якімі і так не самыя добрыя адносіны, будуць да іх прэтэнзіі.

*«Мучаемся ўжо каторы год, носім вёдрамі ваду, зліваем пад ганак, на сваю сцежку. Нам 75 гадоў 3 ліпеня будзе. Уяўляеце, як нам, хворым жанчынам, цяжка цягаць тыя вёдры. З-за таго, што спецтэхніка не можа пад'ехаць і ачысціць каналізацыю, мы нават памыцца па-чалавечы не можам. І пральная машына ў нас новая стаіць ужо два гады не падключаная, якую нам падарылі. Працягваем мыць адзежу ўручную і цягаць вёдры з вадой, выліваць на двор. Гэта ж здзек. Хіба так можна?»*

Паводле слоў сясцёр Перэльман, восенню мінулага года яны звярталіся ў прыёмную Стаўбцоўскага райвыканкама з просьбай даць пісьмовы дазвол на пракладку сістэмы каналізацыі і з тым жа пытаннем падчас прамой тэлефоннай лініі да старшыні райвыканкама.



**«Раней з суседзямі жылі дружна. Глядзіце, — Альберта Якаўлеўна паказвае фотаздымак, — не было ніякіх агароджаў».**

*«Мы прасілі, каб нам дазволілі хоць метраў 10—15 па нашай сцежцы, якая вядзе да брамкі, крыху прадоўжыць каналізацыю, каб можна было выклікаць спецыяльную машыну і чысціць яе. Але атрымалі прыніжальную адпіску, у якой няма ні слова пра каналізацыю. Маўляў, запрашаем звярнуцца ў аддзел землеўпарадкавання з заявай і дакументальна аформіць сваю 1/3 долю ў праве пажыццёвага спадчыннага ўладання на зямельны ўчастак. Нас ігнаруюць і шантажыруюць вырабам дакумента на зямлю. На якую зямлю? Мы не згодны з рашэннем суда, зямельны ўчастак падзялілі несправядліва. У нас няма агарода. Акрамя сцежкі, па якой мы ходзім да дома, у нас усё аднялі. Усе нашы насаджэнні — грушу, чатыры вішанькі — суседзі ссеклі і спалілі. Адзінае, што злева, як брамка адкрываецца, у нас два дрэвы растуць. Іх яны знішчыць не маглі. Няхай спачатку нам аддадуць тое, што ў нас забралі, тады будзем рабіць дакумент».*



**У сясцёр Перэльман 12 катоў, як дарослых, так і кацянят, адзін з іх праводзіў мяне, з надзеяй гледзячы ў акно.**

У жыхароў кватэры № 2 і № 3 на гэтую сітуацыю сваё меркаванне.

*«Маладая сям'я Маркавых у 2013 годзе купіла ў нашым доме кватэру. Засяліліся і пытаюцца ў мяне: «А дзе наша зямля? Дзе можна дзіцячыя арэлі паставіць, пясочніцу?» — кажа Яніна Мурукіна. — Я пацiскаю плячыма. «А дзе ваша тэрыторыя?» — пытаецца Ігар. Я не ведаю. Перэльманы пастаянна крычаць. Там не стань. Там нельга хадзіць. Там не тваё, не маеш ніякага права. Маўляў, мы тут з 61-га года жывём і будзем камандаваць. Такога ж не можа быць. Гэта ж не ваш дом, усе на роўных правах маюць тут кватэры. Што ні пасаджу — усё паламаюць, патопчуць. Самі нічога не робяць, бур'ян расце. І ў мяне павінна так быць? Вось Ігар і пайшоў у райвыканкам пытацца, як можна падзяліць той участак. Звычайна суседзі дамаўляюцца: падзялілі самі пароўну і карыстаюцца. Бо суд — гэта вялікія выдаткі. Мы з Перэльманамі не змаглі мірна дамовіцца, таму звярнуліся ў суд. Судзіліся больш за год. Мы самі нічога не дзялілі. Што прысудзілі па законе, што адмералі, тым я і карыстаюся».*

**Начальнік аддзела землеўпарадкавання Стаўбцоўскага райвыканкама Таццяна ЮНЦЭВІЧ** патлумачыла: «Сёстры Перэльман да нас ужо неаднаразова звярталіся, у кожным звароце пішуць, што ў іх незаконна забралі зямлю. Мы ім тлумачылі, што ніхто ў іх нічога не адымаў, ёсць рашэнне суда Стаўбцоўскага раёна аб вызначэнні парадку карыстання зямельным участкам. Пакольки на яго прадугледжана долевая ўласнасць, то кожнай з трох кватэр дасталася па 1/3 долі. Падкрэслівалі, што гэта рашэнне суда, а не райвыканкама. Выканкам не ў праве ўмешвацца ў рашэнне суда. Жанчыны скарысталіся сваім законным правам і падалі апеляцыю ў Мінскі абласны суд, але ён пакінуў рашэнне раённага суда ў сіле. Калі не згодныя з абласным судом, трэба было аспрэчваць у Вярхоўным судзе. Жыхары дзвюх кватэр у сувязі з тым, што ў іх няма агульнага разумення з сёстрамі Перэльман, звярнуліся ў арганізацыю РУП «Белгеадэзія», каб яна на падставе экспертызы паказала граніцы, вызначаныя судом, на мясцовасці. На ўчастак дома № 66 разам з геадэзістамі выязджала цэлая камісія, у тым ліку прадстаўнік землеўпарадкавальнай службы, участковы».

Паводле слоў **намесніка начальніка аддзела землеўпарадкавання Таццяны ЛОЙКІ,** якая тады была ў складзе камісіі, дзве кватэры ўжо зарэгістравалі сваe долі зямельнага ўчастка. Сёстрам Перэльман засталося толькі напісаць заяву. *«Мы б вынеслі рашэнне, з якім яны звярнуліся ў агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры, і ў іх былі б дакументы на зямлю. Згодна з заканадаўствам, мы не можам прымусіць іх рэгістраваць сваю долю. Але калі яны захочуць, напрыклад, зрабіць рэканструкцыю сваёй часткі дома альбо прадаць кватэру, яны гэтага зрабіць не змогуць. Ні адно натарыяльнае дзеянне сёння немагчыма ажыццявіць без дакументаў на зямельны ўчастак. Жанчынам ужо некалькі разоў усё тлумачылі — і пісьмова, і вусна. Але яны працягваюць пісаць адно і тое ж, фантазіруюць, нагаворваюць на людзей. Заўсёды з імі карэктна кантактуеш, тлумачыш. Але яны не чуюць. Райвыканкам ужо спыніў з імі перапіску. Дык яны да вас у рэдакцыю звярнуліся. Ніхто іх не прыгнятае, не абражае. Калі прыязджаеш да іх, яны зачыняюцца і не ідуць на кантакт. А пасля пішуць, што і дзверы ім ламалі, і шкло білі».*



**Тая самая каналізацыя, якую сёстры Перэльман хочуць працягнуць.**

**Загадчыца сектара па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Ірына КАСЦЕВІЧ** пацвердзіла, што райвыканкам спыніў перапіску з сёстрамі Перэльман. Маўляў, колькі можна чытаць абразы ў адрас мясцовай улады. *«На ўсе іх пісьмовыя звароты да нас мы давалі пісьмовыя адказы згодна з дзеючым заканадаўствам. Тлумачылі, што ім трэба зрабіць, каб узаконіць зямлю. Яны пісалі нам наступны зварот. А дзеянняў ніякіх не распачыналі, у зямельную службу не звярталіся».*

Калі спытала пра каналізацыю, мне параілі звярнуцца ў цэх водазабеспячэння і водаадвядзення Стаўбцоўскага раёна КУП «Слуцкводаканал». Паводле слоў **інжынера Ірыны КАЖАМЯКІ,** дзесьці год таму сёстры Перэльман звярталіся датычна пракладкі каналізацыі.

*— Начальнік участка нашага водаадвядзення туды выехаў, паглядзеў і патлумачыў, што там няма магчымасці падключыцца да цэнтральнай каналізацыі.*

**— А як звычайна на практыцы вырашаюцца падобныя пытанні, калі трэба працягнуць лакальную сістэму каналізацыі?**

*— У прыватным сектары людзі звычайна самі набываюць кольцы, наймаюць экскаватар, брыгаду спецыялістаў і выкопваюць яму там, дзе ім зручна. Нават ніхто не звяртаецца з такой нагоды, дазвол на сваім участку не патрэбны.*

**— Але ж у іх не зарэгістраваная іх доля на зямельны ўчастак...**

*— А вось ці абавязкова трэба афармляць дакументы на зямельны ўчастак для таго, каб працягнуць каналізацыю, вы ўдакладніце ў райвыканкаме.*

З гэтым пытаннем я звярнулася ў аддзел архітэктуры, будаўніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі Стаўбцоўскага райвыканкама. **Начальнік аддзела Яўген КАНДРАТОВІЧ** упершыню ад мяне пачуў пра зварот сясцёр Перэльман і іх праблему з каналізацыяй. Паводле яго слоў, каб на сваім участку пракласці сваю ж лакальную каналізацыю, не трэба мець дазвол райвыканкама.

*— На гэтыя віды работ мы дазвол не даём. Проста ўказваем, што неабходна выконваць санітарныя нормы. Мінімальная адлегласць ачышчальнага збудавання да жылога дома павінна быць не меншай за пяць метраў. Фільтрацыйны калодзеж павінен размяшчацца не менш чым за восем метраў ад пабудовы. Але калі ўчастак не зарэгістраваны, узнікаюць пытанні. А раптам людзі залезуць на землі горада ці іншага землекарыстальніка? Хтосьці ж можа і за агароджай, каб машына не заязджала ў двор, зрабіць каналізацыю. Быццам бы дазвол не патрэбны, але ў той жа момант на землях агульнага карыстання будаваць нічога нельга. І такіх падводных камянёў шмат. Таму самы аптымальны варыянт — спачатку ўзаконіць зямлю, зарэгістраваць яе ва ўстаноўленым законам парадку. І тады ўжо размяшчаць аб'екты водазабеспячэння, водаадвядзення і іншае. З іншага боку, зямельны ўчастак можа быць незарэгістраваны, напрыклад, у яго ёсць межы, якія склаліся з забудовай, і грамадзяне з савецкага перыяду ім карыстаюцца. Каналізацыя — такая рэч, якая сёння павінна быць у кожным доме, дзе ёсць санвузел, ванна. Я лічу, што ў такіх выпадках трэба, каб грамадзяне звярталіся непасрэдна да нас, у райвыканкам, каб мы ведалі, куды яны хочуць пракласці каналізацыю. Таму хай бы падышлі да нас, мы паразмаўлялі б з імі і, магчыма б, выехалі адразу на месца, паглядзелі.*

**— Але ж бабулі з цяжкасцю ходзяць...**

*— Я ўдакладню, што там ды як: якія былі звароты і якія адказы ім давалі. Трэба глядзець, як устаноўлены межы ўчастка. Дакументаў я не бачыў, трэба вывучаць.*

...Гісторыя з каналізацыяй нагадала мне дзіцячую гульню — зламаны тэлефон: калі людзі не пачулі ці не да канца зразумелі адно аднаго. Менавіта з-за гэтага ў жыцці часцей за ўсё і памнажаюцца крыўды, непаразуменні. Калі б яшчэ восенню, пасля звароту сясцёр Перэльман, той, хто займаецца гэтым пытаннем, выехаў бы на месца і паглядзеў на свае вочы на тую каналізацыю, выслухаў і даступна патлумачыў жанчынам усе нюансы — тады, магчыма, крыўды ў адрас мясцовай улады было б хоць крыху, але менш. І ліст на 14 старонак у рэдакцыю ніхто б не пісаў...

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК,**
**фота аўтара.**

Сумесны выпуск газеты «Звязда»
і Міністэрства прыродных рэсурсаў
і аховы навакольнага асяроддзя
№ 2 (65)

## АХОВА НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ — НЕ ПУСТЫЯ СЛОВЫ



**Дарагія сябры, калегі!**

Паважаныя суайчыннікі і госці Беларусі!

Віншую вас з надыходзячым Сусветным днём навакольнага асяроддзя, а эколагаў — з прафесійным святам!

За апошнія дзесяцігоддзі ў краіне палепшылася экалагічная сітуацыя па шэрагу кірункаў, звязаных са станам атмасфернага паветра, водных рэсурсаў і экасістэм, асобных біялагічных відаў. Дасягнуць такіх поспехаў у справе аховы навакольнага асяроддзя атрымалася пры непасрэдным удзеле эколагаў-прафесіяналаў і аматараў, прадстаўнікоў грамадскасці і вучоных. Дзякуй вам за энтузіязм і любоў да прыроды Беларусі, за неабыякавасць і клопат пра яе стан і захаванне самых каштоўных багаццяў: празрыстага паветра, зеляніны лясоў, крыштальнасці рэк і азёр, разнастайнасці відаў флоры і фаўны.

Сёння многія беларускія кампаніі выбіраюць шлях пераходу ад лінейнай да цыркулярнай эканомікі, укараняюць «зялёныя» тэхналогіі ў сваю дзейнасць, шукаюць спосабы зрабіць свой тавар больш карысным як для чалавека, так і для наваколля. За такім адказным, экадружалюбным падыходам — будучыня.

Падрастае маладое пакаленне беларусаў, для якіх ахова навакольнага асяроддзя — не пустыя словы, а штодзённая і любімая справа. Усё больш людзей у краіне цікавіцца праблемамі змены клімату, росту колькасці адходаў, змяншэння біялагічнай разнастайнасці і шукаюць спосабы іх вырашэння. Упэўнены, што толькі сумеснымі намаганнямі людзей самых розных прафесій і ўзростаў — ад школьнікаў да супрацоўнікаў прамысловых прадпрыемстваў — мы зможам зрабіць нашу родную зямлю яшчэ больш чыстай і прыгожай, а суіснаванне чалавека і жывой прыроды — больш гарманічным.

Шчыра жадаю ўсім, хто звязаў сваё жыццё з аховай навакольнага асяроддзя, здароўя, радасці, поспехаў у вашай высакароднай справе, новых цікавых праектаў, дабрабыту і шчасця!

Няхай кожная ваша справа ідзе на карысць роднай прыродзе!

**Андрэй ХУДЫК,**
**міністр прыродных рэсурсаў**
**і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.**

## Лічбы і факты

**— Тэрыторыя Беларусі характарызуецца ўмеранай ступенню гаспадарчага засваення і параўнальна высокай захаванасцю натуральных экасістэм — лясных, лугавых, балотных і водных. Сумарна яны займаюць 57 % плошчы краіны.**

— За два апошнія дзесяцігоддзі ў краіне ў 2,5 раза зменшыліся выкіды забруджвальных рэчываў і скід сцёкавых вод, у два разы зменшылася энергаёмістасць ВУП, у 1,2 раза павялічылася плошча натуральных экасістэм.

**— Штогод у Беларусі ўтвараецца каля 4 млн тон цвёрдых камунальных адходаў. У 2021 годзе ўзровень выкарыстання ЦКА вырас да 29 %.**

— Да 2025 года ў краіне запланавана стварыць 16 рэгіянальных аб'ектаў па сартаванні і выкарыстанні ЦКА і палігонаў для іх захавання. На іх з'явяцца аўтаматызаваныя лініі па сартаванні ЦКА для адбору прыдатных да выкарыстання ДМР, абсталяванне для апрацоўкі арганічнай часткі, вытворчасці RDF-паліва, перасоўныя комплексы для перапрацоўкі будаўнічых, драўняных і буйнагабарытных адходаў, абсталяванне для перапрацоўкі адходаў пластмас, электрычнага і электроннага абсталявання, шын.

**— Валавыя выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра на працягу апошняга дзесяцігоддзя зменшыліся на 9 %. Асноўны ўнёсак у іх аб'ём робяць мабільныя крыніцы — 65 %, на долю стацыянарных прыпадае 35 %.**



— За апошні час палепшыліся асноўныя паказчыкі, якія характарызуюць эфектыўнасць водакарыстання. Аб'ём здабычы вады зменшыўся на 30 %, а выкарыстання — на 31 %. Больш чым на 60 % скараціўся скід недастаткова ачышчаных сцёкавых вод у водныя аб'екты, прычым за апошнія пяць гадоў — амаль у два разы. У 2021 годзе ён склаў 2,26 млн м$^3$, ці менш за 1 % ад агульнага аб'ёму сцёкавых вод, якія скідваюцца ў навакольнае асяроддзе.

**— Агульная плошча асабліва ахоўных прыродных тэрыторый (ААПТ) дасягнула 9,1 % ад тэрыторыі краіны. Для забеспячэння ўзаемасувязі гэтых каштоўных аб'ектаў дзейнічае нацыянальная экалагічная сетка, элементы якой ахопліваюць 16 % тэрыторыі Беларусі.**

— Расце паказчык лясістасці. З 2015 да 2020 года доля лясоў павялічылася з 39,3 да 40,1 % ад плошчы краіны.

**— Павялічваецца ў Беларусі пагалоўе еўрапейскага зубра. За апошнія тры дзесяцігоддзі яго колькасць узрасла больш чым у 6,5 раза і па стане на люты 2022 года склала 2248 асобін.**

Біяразнастайнасць

# ЧЫРВАНАКНІЖНІКІ ПАД ПРЫЦЭЛАМ

### Як знайсці кампраміс паміж аховай рэдкіх відаў і інтарэсамі чалавека?

**У каляпрыроднай суполцы раз-пораз гучаць меркаванні аб выключэнні некаторых відаў жывёл з Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь і адкрыцці на іх палявання. Прадстаўнікі прыродаахоўнай сферы і вучоныя лічаць: лішніх у Чырвонай кнізе няма. Ці можна знайсці ўзаемавыгаднае вырашэнне гэтай праблемы?**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Сігнал трывогі

На тэрыторыі нашай краіны першая Чырвоная кніга была выдадзена ў 1981 годзе. З 2015-га дзейнічае яе чацвёртае выданне, якое ўтрымлівае звесткі пра 303 віды раслін і 202 віды жывёл. У найбліжэйшыя гады плануецца падрыхтаваць да публікацыі пяты варыянт.

— Перад тым як перавыдаць Чырвоную кнігу, вучоныя, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, Мінпрыроды і яго тэрытарыяльных органаў працуюць над выяўленнем месцаў пражывання і росту рэдкіх відаў, над іх перадачай пад ахову землекарыстальнікам, праводзяць мерапрыемствы па захаванні такіх месцаў і ўмоў існавання раслін і жывёл, аналізуюць даныя, звязаныя з колькасцю пэўных біялагічных відаў, — расказаў **Мікалай СВІДЗІНСКІ, начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.** — Многія з такіх відаў сёння на слыху: гэта еўрапейскі зубр, буры мядзведзь, еўрапейская рысь, барсук ды іншыя.

Зубр быў практычна страчаны для чалавецтва. Сістэмная работа, якая праводзілася ў тым ліку ў Белавежскай пушчы і сёння працягваецца ў розных рэгіёнах Беларусі, дазволіла павялічыць колькасць чырванакніжнікаў да 2248 асобін (даныя на люты 2022 года), якія падзелены на 11 мікрапапуляцый.

— Але казаць, што пагроза для знікнення віду мінула і што ў пятым выданні Чырвонай кнігі зубра не будзе, вельмі заўчасна, — упэўнены спецыяліст. — Згодна з планам кіравання яго папуляцыяй, яшчэ не завершана работа па яе фарміраванні. Канчатковая мэта — зрабіць так, каб мікрапапуляцыі злучыліся, і жывёлы маглі свабодна перамяшчацца па ўсёй тэрыторыі.

Акрамя зубра, апошнім часам ад паляўнічай грамадскасці паступае інфармацыя пра павелічэнне колькасці такіх драпежных відаў і чырванакніжнікаў, як буры мядзведзь і еўрапейская рысь.

— Мы вырашылі прааналізаваць інфармацыю, правесці ўлікі і распрацаваць планы кіравання папуляцыямі гэтых відаў, — адзначыў прадстаўнік Мінпрыроды. — Анкетнае апытанне 2021 года паказала, што значна, але не настолькі, каб дасягнуць аптымальнай, павялічылася колькасць бурага мядзведзя (да 588 асобін) і рысі еўрапейскай (1002 асобіны пры аптымальнай у 1500).

**Павел Гештаўт лічыць вартым стварыць сістэму збору інфармацыі пра ўплыў драпежнікаў на жыццядзейнасць чалавека, каб прымаць узважаныя рашэнні, у тым ліку на аснове гэтых даных.**

## Да «праблемных» відаў — гібкія падыходы

Паводле слоў **начальніка аддзела паляўнічай гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Аляксандра КАЗАРЭЗА,** сёння з вышэйназванымі відамі ёсць пэўныя праблемы:

— Зубр мае бінарны статус — гэта значыць, на яго можна паляваць. Від ахоўваецца і пры гэтым выкарыстоўваецца, у чым зацікаўлены і карыстальнікі паляўнічых угоддзяў. Неабходна прадпрыняць наступны крок: некаторыя мікрапапуляцыі зубра вельмі разрасліся, шкодзяць пасевам сельскагаспадарчых арганізацый — жывёл трэба рассяляць. Але мы не можам траціць на гэта грошы ад паляўнічай дзейнасці, бо ён не адносіцца да гэтай катэгорыі. Таму ёсць прапановы перавесці зубра з чырванакніжнага ў звычайны від.

Паводле слоў спецыяліста, ніхто дакладна не ведае фактычную колькасць рысі і мядзведзя. Пад ахову перададзены толькі 9 і 59 месцаў іх пражывання адпаведна. Але хто іх павінен ахоўваць, за якія сродкі, якія мерапрыемствы праводзіць — невядома...

— Міністэрства лясной гаспадаркі выступае за ўзважаны падыход, — падкрэсліў Аляксандр Казарэз. — Мы не кажам, што неабходна выключаць гэтыя віды з Чырвонай кнігі, адкрываць на іх павальнае паляванне. Але калі яны будуць эканамічна выкарыстоўвацца, з'явіцца зацікаўленасць у іх захаванні. Мы зможам атрымліваць даныя маніторынгу па колькасці гэтых відаў, планаваць пэўныя мерапрыемствы.

Згодны з гэтым і **намеснік упраўлення палявання, рыбалоўства і турызму РДГА «БТПР» Уладзімір КАЗЛОЎСКІ:**

— Не трэба разглядаць паляўнічых як знішчальнікаў, якім толькі дай каго-небудзь застрэліць. Яны таксама разумеюць, што важныя ў нашым лесе і воўк, і рысь, і мядзведзь, і зубр. Мы не настойваем на тым, каб усё пад нуль зачышчаць. Але разам з тым прапануем разглядзець пытанне, каб Чырвоная кніга не была жорсткім дакументам. Тым больш што не яна абараняе жывёл, а непасрэдна выканаўцы на месцах.

Паводле слоў паляўнічага, размеркаванне рысі па краіне нераўнамернае. Ёсць і праблемныя тэрыторыі, адкуль ідуць пастаянныя звароты. Таму БТПР прапануе разглядзець комплексны падыход выкарыстання такіх рэсурсаў зыходзячы з іх асаблівасцяў.

## Простых адказаў няма

Ёсць некалькі праблем узаемадзеяння паміж чалавекам і кіраваннем папуляцыямі дзікіх жывёл, адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах Павел ГЕШТАЎТ:**

— Кожны від выконвае ў біягеацэнозах пэўную ролю. Без ваўка, рысі нашы прыродныя ландшафты будуць непаўнавартасныя. Паляўнічыя зацікаўлены ў першую чаргу ў здабычы капытных, таму хочуць рэгуляваць колькасць драпежнікаў. Але яны існавалі заўсёды, і гэта не прыводзіла да дэградацыі папуляцый капытных... У пытаннях захавання дзікіх прыроды няма простых адказаў.

Другая праблема — адсутнасць дакладных методык па падліку колькасці жывёл. Таму ў рабоце з папуляцыямі вучоны прапаноўвае працаваць па параметрах, якія ўскосна паказваюць стан папуляцыі. Гэта колькасць сустрэч у дзікай прыродзе, уплыў на жыццядзейнасць чалавека, павелічэнне ці памяншэнне дарожна-транспартных здарэнняў.

Акрамя таго, не заўсёды жывёлы, размешчаныя на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях, абароненыя, бо іх арэал выходзіць за межы апошніх.

На думку вучонага, пытанне аб выключэнні мядзведзя з Чырвонай кнігі ўзнімаць рана. Трэба працягнуць яго маніторынг ды зрабіць добры план кіравання — прапісаць мерапрыемствы, скіраваныя на змяншэнне негатыўнага ўплыву драпежніка на дзейнасць чалавека.

Галоўны ж аргумент паляўнічых, чаму неабходна адкрыць паляванне на рысь, — тое, што яна ўплывае на казулю і зніжае яе колькасць. Але за тыя нават дзесяцігоддзі, што вядзецца падобная размова, колькасць казулі павялічылася ў шэсць разоў, нягледзячы на тое, што вырасла і колькасць рысі. Вучоны ўпэўнены: не трэба прымаць хуткіх рашэнняў — трэба заўсёды ўзважана падыходзіць да іх прыняцця.

Мікалай Свідзінскі згодны з пазіцыяй калег: Чырвоная кніга — не застылая сістэма. Ён паведаміў, што пасля ўлікаў жывёл у 2021—2023 гадах будуць выпрацаваны мадэлі для пэўных тэрыторый у частцы кіравання папуляцыямі чырванакніжнікаў.

— Галоўны прынцып — не нашкодзь, — сказаў прадстаўнік Мінпрыроды. — Таму ўся работа будзе накіравана на захаванне відаў.

**Інга ЗУБРЫЦКАЯ.**

Парадак на зямлі

# ЯК ПРЫЙСЦІ ДА ЗГОДЫ З АДХОДАМІ

**З надыходам цёплага сезона зноў набывае актуальнасць праблема адходаў, што ўтвараюцца ў садаводчых таварыствах і спажывецкіх кааператывах. На якія нюансы трэба звярнуць увагу?**

## Схема для смецця

— Праваўыя асновы абыходжання з адходамі ў краіне замацаваны адпаведным Законам «Аб абыходжанні з адходамі», накіраваным на змяншэнне аб'ёмаў утварэння адходаў і прадухіленне іх шкоднага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, здароўе грамадзян і маёмасць, а таксама на іх максімальнае выкарыстанне, — кажа **кансультант упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Мінпрыроды Кацярына РАМАСЬКО.**

Паводле слоў спецыяліста, раней парадак абыходжання з адходамі, якія ўтвараюцца ў садаводчых таварыствах і спажывецкіх кааператывах, уключаўся ў схемы абыходжання з такімі адходамі. Яны распрацоўваліся і зацвярджаліся органамі ўпраўлення такіх арганізацый па ўзгадненні з тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды. Але на практыцы сустракаліся выпадкі, калі не было сфарміраваных органаў праўлення і (ці) старшыць, і, адпаведна, схем па абыходжанні з адходамі таксама не існавала. Вынікам гэтага з'яўляліся шматлікія несанкцыянаваныя звалкі на прылеглых тэрыторыях.

Каб змяніць сітуацыю і ўвогуле палепшыць арганізацыю работы па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні тэрыторый населеных пунктаў, у 2019 годзе быў прыняты і набыў моц Закон «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абыходжанні з адходамі». У гэтым дакуменце было прадугледжана, што адходы, якія ўтвараюцца ў садаводчых таварыствах і спажывецкіх кааператывах, уключаюцца ў схемы абыходжання з камунальнымі адходамі. Яны ж распрацоўваюцца і зацвярджаюцца мясцовымі органамі ўлады па ўзгадненні з тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды.





Па словах спецыяліста, гэта дапамагло максімальна забяспечыць стварэнне неабходных умоў для абыходжання з адходамі ў садаводчых таварыствах і спажывецкіх кааператывах у парадку, які выключае забруджванне наваколля і аказанне шкоднага ўздзеяння на здароўе грамадзян і іх маёмасць.

Усяго па стане на пачатак 2022 года ў Беларусі распрацавана 129 схем абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі (ЦКА). З 4501 садаводчага таварыства, якія існуюць у краіне, практычна 100 % уключаны ў такія схемы. Тое ж датычыцца і 2391 гаражнага кааператыва.

## Як арганізоўваецца збор і вываз адходаў?

Сярод прычын, чаму садаводчыя таварыствы не выконваюць патрабаванні заканадаўства аб абыходжанні з адходамі, можна назваць варыянт, калі збор камунальных адходаў ажыццяўляецца каля крыніц іх утварэння і вывазу адходаў па заяўцы. Часта адходы, якія часова захоўваюцца на зямельных участках членаў таварыства, разносяцца ветрам, на іх уздзейнічаюць ападкі і іншыя прыродныя фактары. Так смецце можа забруджваць навакольнае асяроддзе.

Раней у рамках работы, якая праводзіцца ў краіне па змяненні актаў заканадаўства, што рэгулююць дзейнасць садаводчых таварыстваў, Мінпрыроды прапанавала выключыць такі варыянт збору адходаў. Ён прадугледжаны Тыпавымі правіламі ўнутранага распарадку садаводчых таварыстваў, зацверджаных пастановай Савета Міністраў ад 21 ліпеня 2008 года № 1048.

Спецыялісты прыродаахоўнага ведамства лічаць неабходным стварацьь на такіх тэрыторыях спецыяльныя кантэйнерныя пляцоўкі для збору ЦКА і другасных рэсурсаў. Гэта дапаможа зменшыць колькасць несанкцыянаваных звалак.

Увогуле, паасобны збор адходаў — адзін з галоўных кірункаў дзейнасці ў гэтай галіне. Але, на жаль, не паўсюль магчыма размясціць неабходную колькасць кантэйнераў для розных адходаў. Старая забудова некаторых населеных пунктаў, у тым ліку і садаводчых таварыстваў, не дазваляе гэта зрабіць з улікам усіх гігіенічных і супрацьпажарных нормаў. Пры гэтым заўсёды можна знайсці варыянт для кожнага аб'екта, каб сабраць і адсартаваць максімальную колькасць смецця.

Паводле слоў **начальніка ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Мінпрыроды Максіма ТАРАСАВА**, тэрытарыяльныя органы Міністэрства на пастаяннай аснове сочаць за магчымым размяшчэннем адходаў па-за санкцыянаваных месцаў, у тым ліку на прылеглых да таварыстваў ці кааператываў тэрыторыях. За чатыры месяцы 2022 года ў краіне было выяўлена 7416 фактаў несанкцыянаваных звалак, ужо ліквідавана 6009 з іх, а па астатніх вядуцца работы. Частка з гэтых выпадкаў адносіцца і да тэрыторый садаводчых таварыстваў. Да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу прыцягнута 168 вінаватых асоб на агульную суму больш за 190 тысяч рублёў. Прымаліся і іншыя меры для парушальнікаў экалагічнага заканадаўства.

## Захавай рэсурс!

Летам 2020 года ў краіне быў зацверджаны і ўведзены ў дзеянне тэхнічны кодэкс устаноўленай практыкі ТКП 17.11-08-2020 (33040/33140) «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Адходы. Правіла абыходжання з камунальнымі адходамі». Адно з патрабаванняў гэтага дакумента — кампаставанне раслінных адходаў і іх выкарыстанне ўласнікамі ці паасобны збор з перадачай арганікі на кампаставанне спецыялізаваным арганізацыям.

Сістэма паасобнага збору арганічных адходаў толькі пачынае развівацца ў нашай краіне. Таму найлепшым варыянтам спецыялісты лічаць стварэнне кампоставых ям ці выкарыстанне біякампосцераў — так непатрэбныя расліны з участкаў і рэшткі прадуктаў стануць карысным угнаеннем.

Максім Тарасаў таксама звярнуў увагу на тое, што ў заканадаўстве існуе забарона спальваць камунальныя адходы насельніцтвам.

— Знішчэнне адходаў (у тым ліку іх спальванне) з'яўляецца абясшкоджваннем адходаў, якое павінна выконвацца толькі на спецыялізаваных аб'ектах, — тлумачыць спецыяліст. — Акрамя таго, патрабаванні ў галіне аховы атмасфернага паветра кажуць пра забарону спальваць рэчывы ці сумесі рэчываў, якія не з'яўляюцца палівам, матэрыялы і адходы, калі яны не спальваюцца з выкарыстаннем спецыяльных устройстваў і ў адпаведнасці з выкананнем патрабаванняў заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя.

**Настасся АЛЯКСЕЕВА.**

Экавыхаванне

# ПРАЗ ВЕДЫ — ДА ЗАХАВАННЯ ПРЫРОДЫ

## У краіне рэалізоўваецца пілотны праект па стварэнні комплекснай сістэмы экалагічнай асветы грамадскасці

**Важным напрамкам рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і ўстойлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў, а таксама міжнародных прыродаахоўных канвенцый з'яўляецца экалагічнае інфармаванне і асвета грамадскасці. А поспех падобных мерапрыемстваў залежыць ад таго, наколькі актыўна грамадскасць уцягнута ў іх рэалізацыю, у тым ліку згуртаванні, якія пражываюць на канкрэтных тэрыторыях.**



У сярэдзіне мая ў аграгарадку Трабы Іўеўскага раёна запрацаваў аб'ект комплекснай сістэмы экалагічнай асветы грамадскасці. У цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык, прадстаўнікі духавенства, тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды, Іўеўскага райвыканкама, Трабскага сельвыканкама, Праграмы малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду, грамадскага аб'яднання «Беларускі экалагічны рух», адміністрацыі Трабскага яслі-сада — сярэдняй школы, яе вучні і мясцовыя жыхары.

Аўтары праекта паставілі сабе мэту — стварыць і наладзіць функцыянаванне ў рэгіёне ўстойлівай мадэлі экалагічнай асветы для мясцовых згуртаванняў. Потым яе можна будзе маштабаваць у іншых кутках Беларусі. Для выканання мэты быў створаны комплекс дэманстрацыйных аб'ектаў для экалагічнай асветы мясцовых жыхароў і турыстаў. Спецыялісты таксама пачалі працаваць над інфармаваннем па актуальных праблемах аховы навакольнага асяроддзя і павышэннем узроўню экалагічнай свядомасці.



Падчас праекта ў рэкрэацыйнай зоне аграгарадка Трабы былі ўсталяваны стэнды з інфармацыяй аб прыродным патэнцыяле тэрыторыі і актуальных экалагічных праблемах рэгіёна. Каб праводзіць семінары і трэнінгі па экалагічнай тэматыцы, там пабудавалі пляцоўку для арганізацыі масавых мерапрыемстваў.

Яшчэ адной важнай часткай пілотнага праекта стала акцыя па ачыстцы прыбярэжнай паласы ракі Клява ад смецця і яе добраўпарадкаванне. Акрамя таго, міністр і іншыя ўдзельнікі мерапрыемства пры падтрымцы навукоўцаў Акадэміі навук Беларусі зарыбілі раку для павышэння ўстойлівасці функцыянавання яе экасістэм. Трэба адзначыць, што гэты прыродны аб'ект мае важнае значэнне для функцыянавання воднай сістэмы Нёман — Балтыйскае мора.

Кіраўнік Мінпрыроды Андрэй Худык выказаў упэўненасць, што аб'ект комплекснай сістэмы экалагічнай асветы грамадскасці, які з'явіўся ў аграгарадку Трабы, стане цудоўным прыкладам, а таксама заахвоціць добраўпарадкоўваць тэрыторыі ў іншых населеных пунктах нашай краіны.

У планах аўтараў пілотнага праекта — абсталяванне лакальнага цэнтра экалагічнай асветы, створанага на базе ВПК Трабскі яслі-сад — сярэдняя школа, дэманстрацыйнымі стэндамі і спецыяльнымі трэнажорамі, падрыхтоўка інфармацыйных матэрыялаў па праблемах змены клімату, захавання біяразнастайнасці, кіравання воднымі рэсурсамі і іншых аспектах аховы навакольнага асяроддзя. Збіраюцца таксама праводзіць інфармацыйныя сустрэчы з мясцовым насельніцтвам.

Напрыканцы мерапрыемства яго ўдзельнікі ўзялі ўдзел адразу ў дзвюх акцыях — «Дрэва героя», ініцыяванай Мінпрыроды і прымеркаванай да Года гістарычнай памяці, і «Бэз Перамогі» — сумеснай беларуска-расійскай традыцыі, распачатай у 2011 годзе Саветам Батанічных садоў дзвюх краін. На набярэжнай Клявы яны высадзілі больш за 200 саджанцаў ліпы, бэзу, розных відаў вярбы і кустоў.

**Таццяна ІВАНОЎСКАЯ**

**Фота minpriroda.gov.by**

Праект па стварэнні комплекснай сістэмы экалагічнай асветы грамадскасці рэалізаваны Мінпрыроды сумесна з грамадскім аб'яднаннем «Беларускі экалагічны рух» пры фінансавай падтрымцы Праграмы малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **Унитарное предприятие «Копыльский кооппром», 223927, Минская обл., г. Копыль, ул. Заозерная, 82, тел./факс 23-5-71 (801719)** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортное средство, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: Минская обл., г. Копыль, ул. Заозерная, 82**

| Наименование | Инвентарный № | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг торгов, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Грузовой фургон-рефрижератор Mercedes-Benz 409 D,** рег. знак AI 3515-5, 1987 г. в. | 303 | 10 800,00 (снижена на 10 %) | 540,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5 (пять)** рабочих дней после проведения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | 100 % в течение **5 (пяти)** календарных дней после подписания договора купли-продажи |

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **5 (пять) процентов** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Извещение о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» от 23.04.2022 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 13.06.2022 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по **10.06.2022 г. до 17.00**

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-12.

**Продавец**: Открытое акционерное общество «Витебский райагросервис», 210034, г. Витебск, ул. Ленинградская, 217, тел. (0212) 64-21-41; факс: 64-21-37.

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-500764 площадью 1022,4 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, 217/8, наименование – ангар, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель. Кап. строение находится на земельном участке с кадастровым № 240100000002000014 площадью 4,6566 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, 217, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания административного и производственных зданий (общее долевое право аренды, доля в праве – 109/200).

**Обременение** – запрещение совершения регистрационных действий в отношении капитального строения с инв. № 200/С-500764 и в отношении 109/200 доли в праве аренды земельного участка. Запрет на совершение регистрационных действий будет снят при условии перечисления покупателем денежных средств за приобретенный предмет аукциона на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома.

**Нач. цена: 96 000,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток: 9600,00 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 16.06.2022 в 15.00 по адресу:** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Срок внесения задатков и окончания приема документов: с 31.05.2022 с 8.30 по 15.06.2022 до 17.30. Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.**

Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 06.04.2022 г.

**Условия повторного аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить расходы на проведение независимой оценки; подписать договор купли-продажи предмета аукциона в течение 11 рабочих дней с даты проведения аукциона, оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. *Расходы Доверителя по проведению независимой оценки составляют 597,60 бел. руб. с НДС.* **Повторный аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ.лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона.

Доп. информацию по торгам можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (29) 510-07-63, (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 391-24-60, Станкевич Олег Чеславович.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 23 июня 2022 года на 13-м открытом аукционе проводит 11-й от 26 мая 2022 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 117 | Автомобиль ЗИЛ-131 ш. 707423 с кузовом-фургоном КБ4.131 № 08774, 1986 г., 3 кат., пробег 3713 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 11 500,00 | 2 300,00 |
| 118 | Автомобиль ЗИЛ-131 ш. 550748 с кузовом-фургоном КБ4.131 № 08265, 1983 г., 3 кат., пробег 3869 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 11 500,00 | 2 300,00 |
| 119 | Автомобиль ЗИЛ-131 ш. 600750 с кузовом-фургоном КБ4.131 № 07684, 1984 г., 3 кат., пробег 1804 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 11 500,00 | 2 300,00 |
| 120 | Автомобиль ЗИЛ-131 ш. 538831 с кузовом-фургоном КБ4.131 № 05423, 1983 г., 3 кат., пробег 1102 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 11 500,00 | 2 300,00 |
| 121 | Автомобиль ЗИЛ-131 ш. 331567 с кузовом-фургоном К2.131 № 05245, 1978 г., 3 кат., пробег 1176 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 11 500,00 | 2 300,00 |
| 126 | Специальный автомобиль Урал-43203-1012 с кузовом-фургоном К2-4320 в составе: кузов-фургон К2-4320 № 01576, 1988 г., 2 кат.; автошасси Урал-43203-1012, ш. 099565, дв. 824015, 1988 г., 3 кат., 2330 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 25 000,00 | 5 000,00 |
| 127 | Специальный автомобиль КамАЗ-4310 с кузовом-фургоном К1-4320Д в составе: кузов-фургон К1-4320Д № 0989, 1988 г., 2 кат.; автошасси КамАЗ-4310 ш. 0047779, дв. 976224, 1988 г., 3 кат., 6003 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 30 000,00 | 6 000,00 |
| 128 | Специальный автомобиль Урал-43203-1012 с кузовом-фургоном К2-4320 в составе: кузов-фургон К2-4320 № 11174, 1988 г., 4 кат.; автошасси Урал-43203-1012 ш. IO109060, дв. 566672, 1988 г., 4 кат., 12670 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 23 000,00 | 4 600,00 |
| 129 | Специальный автомобиль Урал-43203-1012 с кузовом-фургоном К2-4320 в составе: кузов-фургон К2-4320 № 11172, 1988 г., 4 кат.; автошасси Урал-43203-1012, ш. IO108407, дв.497587, 1988 г., 4 кат., 10421 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 23 000,00 | 4 600,00 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 23 июня 2022 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 20 июня 2022 года**. Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 23 июня 2022 г. с 9.15 до 10.00.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факс: **(017) 319-35-41, (017) 367-58-05.**

Электронная почта: **auk@bsk.by**.

Извещение опубликовано на сайте **http://www.gki.gov.by/ru и https://bsk.by.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Предмет аукциона – Лот:** 1) Капстроение с инв. № 235/С-9641 (наименование: склад; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 1388,5 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, Лукомльский с/с, 13, восточнее д. Богатырь, составные части и принадлежности: навес; 2) капстроение с инв. № 235/С-9642 (наименование: открытая складская площадка; назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ), площадью 5360,1 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, Лукомльский с/с, восточнее д. Богатырь, составные части и принадлежности: ограждение, двое ворот, две площадки; 3) стройматериалы, вложенные в строительство следующих объектов, расположенных по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, Лукомльский с/с, восточнее д. Богатырь: 3.1) Административно-бытовой корпус ГПК (объект 2/87-1-1); 3.2) административно-бытовой корпус РММ (объект 2/87-8-1); 3.3) Внутриплощадочные сети водопровода (объект В1-В3 2/87-ОНВК); 3.4) Газораспределительный пункт (объект 2/87-13); 3.5) Котельная с инженерными сооружениями (объект 2/87-5); 3.6) Ливневая канализация, пруды-отстойники (объект 2/87 0-НВК); 3.7) Наружное электроснабжение (объект 2/87-С1-ЭС); 3.8) Подъездная автодорога с проездами и площадками (объект 2/87-0); 3.9) Пожарное депо (объект 2/87-16); 3.10) Цех подготовки сырья (объект 2/87-3). Все объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 225183012101000094, площадью 26,3060 га

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | 32 018,00 | **Размер задатка, руб.** | 3 201,80 |

**Продавец:** дирекция строящегося государственного предприятия «Завод глиняного кирпича», 211162, Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона не позднее 20 апреля 2022 г. 17.00. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи в течение 15 дней с даты подписания договора купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Шаг торгов:** 5 % от начальной цены продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона оплачивает затраты на организацию и проведение торгов, в том числе вознаграждение Организатору аукциона

**Аукцион состоится 16 июня 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона и иная инфорация содержатся на официальном сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве bankrot.gov.by, на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 15 июня 2022 г. до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2022.Ч.002.00048** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебский приборостроительный завод», 210026, г. Витебск, ул. Гагарина, 4, тел. 8 (0212) 36-27-07.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 04.07.2022 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-44392 площадью 2891,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4, наименование – производственный корпус, назначение – здание специализированное для металлургического производства и металлообработки, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000001000497 площадью 3,9964 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4 (общая долевая аренда), целевое назначения – земельный участок для обслуживания административно-производственных зданий и сооружений трубопроводного транспорта. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с законодательством.

**Нач. цена: 188 234,14** бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 18 823,41 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 01.07.2022. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Доверителя на проведение независимой оценки (322,70 бел. руб. с НДС 20 %) и на проведение независимой экспертизы внутренней оценки (338,64 бел. руб. с НДС 20 %), оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 11 (одиннадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Позняк Светлана Георгиевна, +375 (33) 317 50 00.

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Хойникский КБО»** (УНП 400056519) 247622, Гомельская область, г. Хойники, ул. К. Маркса, 28, тел.: +375 232 31-59-72, +375 29 135-78-72.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **15 июня 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

**Предмет торгов – капитальное строение с инв. № 343/С-95722, Гомельская обл., Хойникский р-н, Борисовщинский с/с, аг. Храпков, ул. Строительная, 46А, общ. пл. – 89 кв. м, здание специализированное для бытового обслуживания населения. Кадастровый номер земельного участка 325480802101000076.**

Начальная цена предмета торгов – 14 220,00 бел. руб. с НДС.
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.
Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09:00 01.06.2022 г. по 17.00 14.06.2022 г. 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано 23.04.2022 г.

# ЛЕГЕНДАРНЫ АРТЫЛЕРЫЙСКІ КАМБРЫГ

## Анатоль Разынка нарадзіўся ў пухавіцкай Блоні



**Штораз праязджаючы праз Блонь, стараюся ехаць з Мар'інай Горкі альбо ў Мар'іную Горку з Зацітавай Слабады, Пухавіч так, каб не абмінуць Блонскую школу. На яе пляцы былі і іншыя старадаўнія сядзібы. Недзе тут стаяў касцёл. Яны, касцёл і не такая далёкая Царква Святой Тройцы, літаральна паблізу. Вобразна кажучы, маглі б гэтыя збудаванні і ўглядацца адзін у аднаго... А за нейкі кіламетр ці меней — і колішняя панская сядзіба Бонч-Асмалоўскіх... Тут, у гэтай гістарычнай прасторы, праходзіла дзяцінства, юнацтва Анатоля Францавіча Разынкі (1890—1937)...**

Нарадзіўся будучы савецкі военачальнік у Блоні ў верасні 1890 года. «Гартаю» памяць, думаю: а ці згадвалі яго калі-небудзь у Беларусі?.. Ці адзначаўся, напрыклад, яго стагадовы юбілей — у 1990-м?.. Ці ўслаўлялі земляка ў наступныя юбілейныя гады — у 2000-м, 2010-м, 2020-м..? Наўрад ці.

Электронныя крыніцы інфармацыі акрэсліваюць, што нарадзіўся Анатоль у сядзібе, маёнтку. Відаць, бацька, паляк па нацыянальнасці, служыў у саміх Бонч-Асмалоўскіх... І мо некаторыя дакументы пра першыя гады жыцця Анатоля Францавіча знайшліся б у звязку з дакументальнымі сведчаннямі пра Бонч-Асмалоўскіх?... Мо і гулялі яны разам, Толя Разынка і дзеці Бонч-Асмалоўскіх, — якраз жа з 1890 года нараджэння і Глеб Анатолевіч Бонч-Асмалоўскі, доктар гістарычных навук, які знайшоў астанкі неандэртальскага чалавека ў Крыме ў 1924 годзе. Пэўна ж, Анатоль быў навідавоку і па іншай прычыне... Бацька, Франц Разынка, іграў на аргане ў мясцовым касцёле. А маці Анатоля — руская...

Наш зямляк закончыў двухкласнае пачатковае вучылішча ў павятовым цэнтры — Ігумене. Цяпер — горад Чэрвень, раённы цэнтр... Відавочна, маецца на ўвазе Ігуменскае мужчынскае двухкласнае царкоўнапрыходскае вучылішча Мінскай дырэкцыі народных вучылішчаў. Існавала навучальная ўстанова ў 1836—1913-я гады... З гэтай навучальнай установай звязаны многія славутыя асобы.

У 1907-м Анатоль Разынка здае экстэрнам экзамены за тры класы гімназіі на Украіне, у горадзе Умань. У 1907—1910 гг. ураджэнец Блоні жыве і працуе перапісчыкам у Рызе і Пецярбургу. У горадзе на Няве — у часопісе «Сельское хозяйство». У 1910 годзе юнак паступіў у прыватнае камерцыйнае вучылішча. Вывучаў таваразнаўства, знаёміўся з хімічнымі і фізічнымі якасцямі тавара. Атрымліваў новыя веды ў галіне тэхнікі і тэхналогіі. Вучыўся добра, за што быў вызвалены ад аплаты за навучанне. У 1910-м Анатоль паступіў у Пецярбургскі політэхнічны інстытут. Але доўга студэнтам пабыць не давялося. Пачалася Першая сусветная вайна...

Як і многіх яго аднакашнікаў, Анатоля Разынку прызываюць у войска. Маладога чалавека накіроўваюць на вучобу ў Канстанцінаўскае артылерыйскае вучылішча. Старэйшая вайсковая навучальная ўстанова існавала ў Петраградзе з 1807 да 1918 года. Галоўным чынам тут вывучалі дакладныя навукі: матэматыку, аналітычную геаметрыю, дыферэнцыяльнае вылічэнне, пачаткі інтэгральнага вылічэння, фізіку, хімію, чарчэнне. Навучаліся пешаму і коннаму страю, статутам, гімнастыцы, верхавой яздзе, фехтаванню. У лагеры курсанты-артылерысты праходзілі практычны курс стрэльбаў, тапаграфічныя здымкі, вырашалі тактычныя задачы. З восені 1914 года вучылішча перайшло на паскораны курс навучання з 6—8-месячнай праграмай па падрыхтоўцы афіцэраў-артылерыстаў. Афіцэры выпускаліся ў чыне прапаршчыка. З тых, хто разам з Анатолем выпусціўся з вучылішча ў 1915 годзе, — і будучы генерал-палкоўнік артылерыі Сямён Краснапеўцаў (1896—1954; у час Вялікай Айчыннай вайны — камандуючы артылерыяй шэрагу франтоў), будучы генерал-лейтэнант танкавых войск Ізмаіл Нагайбакаў (1896—1959; займаў пасаду начальніка штаба 1-й гвардзейскай танкавай арміі), Альберт Румба (1892—1962; падпалкоўнік Латвійскай арміі, латышскі і савецкі спартыўны функцыянер, у 1924-м і 1928 г. удзельнічаў як канькабежац у зімовых Алімпійскіх гульнях)...

Прапаршчык Анатоль Разынка трапляе на Паўднёва-Заходні, пасля — Румынскі фронт. Ваюе ў складзе 18-га марцірнага дывізіёна. Займае пасады малодшага афіцэра батарэі, дывізіённага ад'ютанта, старшага афіцэра батарэі. Загадвае гаспадаркай артылерыйскай батарэі, часова выконвае абавязкі камандзіра батарэі. Адзнака таго, як ваяваў на франтах Першай сусветнай прапаршчык Разынка, — баявыя ўзнагароды: ордэны Святой Анны 2-й, 3-й, 4-й ступені, ордэны Святога Станіслава 2-й і 3-й ступені, ордэн Святога Уладзіміра 4-й ступені, Георгіеўскі крыж 4-й ступені, Георгіеўская зброя «За адвагу». Можна толькі здагадвацца, якім аўтарытэтам і ў камандзіраў, і ў салдат карыстаўся такі мужны, смелы афіцэр... Пасля Лютаўскай рэвалюцыі Анатоля Францавіча абіраюць старшынёю батарэйнага і дывізіённага камітэтаў. У кастрычніку 1917 года нашага земляка выбіраюць камандзірам батарэі 18-га марцірнага дывізіёна. У канцы 1917 — пачатку 1918 года Анатоль Францавіч выводзіць сваю батарэю (у складзе дывізіёна) у Бесарабію, да станцыі Бірзула. Затым артылерысты эшалонам пад началам штабс-капітана Разынкі выпраўляюцца ў Петраград.

У Чырвонай Арміі ўраджэнец Блоні — з 1918 года. Удзельнічаў у Грамадзянскай вайне. Ваяваў на Паўднёвым фронце. Займаў пасаду ад'ютанта 1-га гаўбічнага дывізіёна 1-й арміі. Затым быў справаводам акруговага артылерыйскага ўпраўлення, у студзені 1919 года ўзначаліў аддзел артылерыі таго самага ўпраўлення. У жніўні 1919 года А. Разынку прызначаюць памочнікам начальніка артылерыі Прыўральскай ваеннай акругі. У той час тэрыторыя акругі распаўсюджвалася на Омскую, Табольскую, Чалябінскую губерні. Пазней далучылі Башкірскую АССР, а ў маі 1921 года — Паўночна-Дзвінскую губерню...

Завяршаецца Грамадзянская вайна. Анатоль Разынка працягвае служыць на адказных пасадах у артылерыі Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі. У 1921—1922 гг. ён — памочнік начальніка артылерыі Заходне-Сібірскай ваеннай акругі. З чэрвеня 1923 года — памочнік начальніка артылерыі Прыволжскай ваеннай акругі. Восенню 1923-га паступае ў Вышэйшую артылерыйскую школу. У кастрычніку 1924 года яго прызначаюць начальнікам артылерыі 11-га стралковага корпуса. Праз год Анатоль Разынка — памочнік інспектара артылерыі і бронесіл Ленінградскай ваеннай акругі. З лістапада 1926 года — памочнік начальніка артылерыі Ленінградскай акругі. У сакавіку 1927 года нашага земляка прызначаюць начальнікам артылерыі Маскоўскай ваеннай акругі. Некаторы час Анатоль Францавіч служыць пад камандаваннем Георгія Дзмітрыевіча Базілевіча, славутага камандзіра часоў Грамадзянскай вайны (у 1938 годзе яго арыштуюць, а ў сакавіку 1939-га расстраляюць). Затым, у маі 1927 года, камандуючым Маскоўскай акругі прызначаць Барыса Міхайлавіча Шапашнікава (у будучыні — Маршал Савецкага Саюза, у час Вялікай Айчыннай вайны на працягу амаль года — начальнік Генеральнага штаба РСЧА; з канца 1930-х гадоў — галоўны дарадца І. Сталіна па ваенных пытаннях)...



Царква Святой Тройцы ў Блоні.

Анатоль Францавіч працягвае набываць новыя веды. Вучыцца на курсах пры Ваеннай акадэміі імя М. В. Фрунзэ. У 1929 годзе тры з паловай месяца знаходзіцца ў службовай камандзіроўцы ў Германіі. Са студзеня 1932 года наш зямляк займае пасаду намесніка начальніка Артылерыйскага ўпраўлення РСЧА. У 1935 годзе Анатолю Францавічу прысвойваюць званне камбрыга.

Бліскучая вайсковая кар'ера ўраджэнца Блоні праходзіла ў няпростых палітычных умовах развіцця краіны. З аднаго боку, трэба было рухацца па шляху актыўнага ваеннага будаўніцтва, развіцця і ўмацавання сучаснай ваеннай дактрыны. З другога — пастаянна азірацца, як гэты рух будзе ацэнены, каго можна незнарок пакрыўдзіць... Яшчэ ў 1926 годзе М. Тухачэўскі, які пасля стане адным з першых пяці Маршалаў Савецкага Саюза, зробіць даклад «Абарона Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік», у якім былі агучаны і такія словы: «Ні Чырвоная Армія, ні краіна да вайны не гатовыя». Сталін абвінаваціў дакладчыка ў спробах стварыць «чырвоны мілітарызм»: маўляў, сяляне яшчэ ў лапцях ходзяць, а ты прапаноўваеш тысячы танкаў будаваць для арміі... І ўсё ж да Тухачэўскага прыслухоўваліся: з 15 сакавіка 1934 года ён — намеснік народнага камісара абароны. У лютым 1933 года Тухачэўскага ўзнагародзілі ордэнам Леніна. А ў 1931-м па найбуйнейшай справе «Вясна» былі арыштаваны 3,5 тысячы былых афіцэраў царскай арміі. І тых, хто служыў у Чырвонай Арміі, і тых, хто не служыў. Падпаручык царскай арміі (адзначаны за паўгода службы пяццю рознымі ордэнамі!) піша артыкул і дакладную запіску «Контррэвалюцыя на ваенна-навуковым фронце». Абвінавачвае найбуйнейшага ваеннага тэарэтыка Аляксандра Свечнікава ва ўсемагчымых грахах. І ўсё ж арыштавалі па абвінавачванні ў «ваеннай змове» і Тухачэўскага. Крыху пазней... Асновай для арышту камбрыга Разынкі паслужылі паказанні самога Тухачэўскага... Перад катаваннямі выстаяць было нялёгка. Следчыя НКУС выбілі паказанні на ўдзел у змове і ад самога Анатоля Францавіча. 1 ліпеня 1937 года нашага земляка расстралялі...

Арыштавалі і жонку камбрыга — Клаўдзію Гаўрылаўну Разынку (Крупенскую). Тэрмін зняволення жанчына адбывала ў сумна славутым Акмолінскім лагеры жонак здраднікаў Радзімы, затым — у Карагандзінскім лагеры, Пячорлагу (Рэспубліка Комі). У лагерах працавала медсястрой. Вызвалілі датэрмінова. Вярнуўшыся ў Маскву, працавала медсястрой акадэміка М. Бурдэнкі ў Галоўным ваенным шпіталі Чырвонай Арміі. Рэабілітавалі Клаўдзію Гаўрылаўну ў 1956 годзе. Яе дачцэ ад першага шлюбу на момант арышту было 14 гадоў: Алена Уладзіміраўна Крупенская заставалася адна ў Маскве. Закончыла маскоўскую школу № 70, затым — хімічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працавала ў Інстытуце біяхіміі АН СССР, затым — ва Усесаюзным навукова-даследчым інстытуце крыніц току (пазней — НВА «Квант»).

Вось і ўся кароткая біяграфія Анатоля Францавіча Разынкі (1890—1937) і яго сям'і... І за гэтым «сінопсісам» лёсу разумнага сялянскага хлопца, у генетычнай канстытуцыі якога было закладзена шмат энергіі, — біяграфія часу, біяграфія будаўніцтва Савецкай краіны. Балюча, што пад жорнавы рэпрэсіўнай машыны траплялі людзі, у большасці яркія, шматгранныя асобы, якія шмат яшчэ маглі зрабіць. І для Чырвонай Арміі, і для ўмацавання абараназдольнасці дзяржавы. Мы не ведаем, як было б на самай справе, калі б сотні рэпрэсіраваных военачальнікаў, тысячы камандзіраў засталіся ў страі... Але, відаць, Савецкі Саюз панёс бы ўсё ж меншыя страты ў 1941 годзе... З пяці маршалаў «першага прызыву» былі расстраляны двое, адзін памёр пад вартай. З 201 камдыва расстралялі 122. З 474 камбрыгаў расстралялі 201. 15 камбрыгаў памерлі ў зняволенні, адзін камбрыг скончыў жыццё самагубствам. 30 вярнуліся з лагера жывымі... Адзін з расстраляных — ураджэнец Блоні камбрыг Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі Анатоль Францавіч Разынка.



Сядзіба Бонч-Асмалоўскіх у Блоні.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

# ТРЭНАЖОР СУПРАЦЬ ІНТЭРНЭТ-ЦКАВАННЯ

## МТС стварыла воркбук для абароны ад кібербулінгу

**ДАПАМОЖНІК для дзяцей і падлеткаў #ІнтэрнэтБезБулінгу прэзентавала кампанія МТС разам з Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі падчас фестывалю «Школа, вольная ад насілля (булінгу)», які стаў чарговым этапам рэалізацыі ў Беларусі праекта па супрацьдзеянні булінгу ў школах. Адмысловы воркбук (фактычна гэта сапраўды «рабочая кніга» і сапраўдны трэнажор), дзе падлеткі могуць выконваць творчыя практыкаванні і занатоўваць свае думкі аб праблеме, а яшчэ — мець пад рукой парады прафесіяналаў аб правілах паводзін у інтэрнэце.**




### Ахвярай можа стаць кожны

З кібербулінгам можа сутыкнуцца абсалютна любы чалавек, незалежна ад полу, узросту, знешнасці, перакананы спецыялісты. Яму падвяргаюцца ад 18 да 45 % падлеткаў, а 90 % інтэрнэт-карыстальнікаў у свеце сустракаюцца з агрэсіяй у сеціве. Падчас прэзентацыі дапаможніка спецыялісты расказалі падлеткам пра розныя аспекты «жыцця» і бяспекі ў анлайн-прасторы.

— Хоць інтэрнэт — досыць новая з'ява, усе мы прывыклі з яго дапамогай лёгка і зручна вырашаць мноства бытавых праблем, адпачываць і мець стасункі. Аднак разам з гэтым у наша рэальнае жыццё прыйшлі і розныя рызыкі, у тым ліку цкаванне. Булінг стаў актуальнай праблемай і распаўсюджаны ва ўсіх краінах, дзе ёсць інтэрнэт. Стаць ахвярай агрэсіі досыць проста — дастаткова напісаць нейкую смешную фразу ці апублікаваць няўдалае фота, — расказала **Таццяна КОЛАС, педагог-псіхолаг Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі БДПУ імя М. Танка,** яна растлумачыла дзецям, чаму інтэрнэт-карыстальнікам цяжка жыць у сяброўстве, якія формы можа набываць агрэсія ў сеціве і з якімі наступствамі могуць сутыкнуцца ўдзельнікі канфлікту.

Калі нейкая непрыемная сітуацыя здарылася адзін раз — гэта хутчэй за ўсё канфлікт. Калі ж непрыемныя праявы адбываюцца сістэматычна, то гэта ўжо булінг. Пры гэтым у канфлікце можна неяк дамовіцца, а булінг — толькі спыніць.

— У сітуацыях булінгу заўжды ёсць агрэсія і насілле. Такія выпадкі рэгулярна паўтараюцца ў дачыненні да аднаго і таго ж чалавека. Непрыемнасці робяцца наўмысна. Ахвяра не можа сябе абараніць сама, —







пералічыла прыкметы булінгу псіхолаг.

Майстар-клас па бяспецы ў інтэрнэце для падлеткаў правёў **Андрэй СІДЗЕНКА, кіраўнік кірунку па дзіцячай анлайн-бяспецы «Лабараторыя Касперскага».** Ён даў дзецям некалькі парад, як абараніць свае даныя ў інтэрнэце.

— У сеціве, вывучаючы інфармацыю пра карыстальніка, можна знайсці пра яго шмат інфармацыі: месца жыхарства, нумар школы, месцы, дзе падлетак часта бывае, яго хобі і зацікаўленасці. Таму, перш чым размясціць аб сабе нейкія звесткі, трэба добра падумаць, а некаторыя лепш не публікаваць увогуле, — параіў ён.

Напрыклад, па нфармацыі аб нараджэнні можна даведацца, што вы дзіця. Не пісаць нікому даныя банкаўскай карткі і не ўказваць геалакацыю на здымках. Нікому не казаць свой пароль. Быць уважлівым, пагаджаючыся на запыт аб сяброўстве ў сацыяльных сетках. Не дзяліцца асабістай інфармацыяй. Хаваць сваё месцазнаходжанне. Сачыць за настройкамі прыватнасці. Заўжды выходзіць са свайго акаўнта, калі карыстаецеся ім на чужых прыладах. Не рабіць у анлайне таго, што ў рэальным жыцці падалося б вам небяспечным. Вытрымліваць правілы ветлівых стасункаў. Звяртацца па дапамогу да дарослых.



### Асабісты дзённік з парадамі і заданнямі

Сумесна з Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі МТС вядзе праект #інтэрнэтБезБулінгу, у межах якога кампанія ўжо выпусціла тэст-трэнажоры і адукацыйныя відэаролікі, а цяпер стварыла воркбук па антыбулінгу, які падыходзіць не толькі дзецям, але і бацькам з настаўнікамі.



— Рыхтуючы воркбук, мы не мелі на мэце стварэнне падручніка. Гэта дапаможнік з карысной інфармацыяй па кібербулінгу, дзе гэтая з'ява паказана з боку ахвяры, булера і назіральніка. Усе ілюстрацыі стваралiся спецыяльна для дапаможніка беларускай мастачкай Наталляй Грабёнкінай. А кантэнт дапаможніка прапрацоўваўся сумесна з псіхолагам Ілянай Матвіенкай і кіраўніком праекта «інтэрнэт-бяспека дзяцей Беларусі Netka.by» Вольгай Корсун, — расказала, прэзентуючы дапаможнік, **Марыя ПАЗНЯК, кіраўнік групы па сувязях з грамадскасцю кампаніі МТС.**

Гэты трэнажор, пэўна, можа стаць асабістым дзённікам падлеткаў, бо ў ім расказваецца не толькі пра тое, як абараніцца ад кібербулінгу, але і даюцца перасцярогі для дзяцей, каб яны самі не сталі булерамі і хейтарамі. А яшчэ ў воркбук можна запісаць свае пачуцці і эмоцыі.

— МТС займаецца тэмай інтэрнэт-бяспекі дзяцей не першы год. За гэты час у школах праводзілася мноства семінараў. На працягу некалькіх гадоў існавала выстава «Сусвет інтэрнэту», у межах якой сумесна з ЮНІСЕФ у Беларусі мы праводзілі апытанку, у якой паўдзельнічала больш як 12 тысяч дзяцей, каб даведацца, як падлеткі карыстаюцца інтэрнэтам, — нагадала Марыя Пазняк.

Аказалася, што сучасныя малыя становяцца інтэрнэт-карыстальнікамі ўжо з пяці-шасці гадоў, і трэць з іх сутыкаецца ў сеціве з хейтарамі. Пры гэтым абсалютная большасць нічога не кажа пра гэта бацькам. Такая інфармацыя і падштурхнула кампанію да стварэння праекта #ІнтэрнэтБезБулінгу, каб дапамагчы дзецям, якія сутыкаюцца з насіллем і цкаваннем у інтэрнэце. Кампанія МТС як пастаўшчык інтэрнэт-паслуг бачыць сваю адказнасць у фарміраванні бяспечнага асяроддзя.

Дапаможнік ўжо можна спампаваць у інтэрнэце і карыстацца ім, а МТС будзе і далей працаваць з тэмай бяспекі ў інтэрнэт-асяроддзі.

**Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ,**
**Ірына СІДАРОК.**

УНП 800013732

## Вера ПАЛЯКОВА:

# «КАЛІ ЎБАЧУ ТВОР БЕЛАРУСКАГА АЎТАРА, ЯКІ ЎРАЗІЦЬ МЯНЕ, НЕСУМНЕННА ПАСТАЎЛЮ»

**Калі тэлефануеш Веры Паляковай, у якасці застаўкі чуеш музыку вядомай песні «Сярэбраная завіруха». Невыпадкова — бо гэта хіт, выкананы актрысай Верай Паляковай як спявачкай... Вось адразу і сутыкаешся са шматаблічнасцю гераіні гутаркі. А сярод тых абліччаў — актрыса, спявачка, тэлевядучая, прадзюсар, мастацкі кіраўнік, выкладчык, клапатлівая маці, жонка дыпламата... А з нядаўняга часу яшчэ і дырэктар Тэатра юнага гледача.**

**Пра гэтую новую ролю Веры Паляковай і зайшла напачатку гаворка.**

***— Акрамя таго, што вы прафесійная актрыса, вы яшчэ і маеце дыплом эканаміста-менеджара... Сапраўды, шматгранная... А ў дзіцячых спектаклях часта даводзілася іграць?***

— Вядома, у мяне вялікі досвед працы ў дзіцячых спектаклях. Пра гэта ведае той жа Палац Рэспублікі, дзе я іграла ў навагодніх казках. Я лічу, што ў нас ёсць добрыя спектаклі для дзяцей, што мяне вельмі радуе. Але мы ў Тэатры юнага гледача зараз робім акцэнт на вячэрні рэпертуар, для ўзросту 12+ — падлеткаў і моладзі, хацелася б, каб наш тэатр больш працаваў для гэтай катэгорыі. Каб мы змаглі зачараваць і моладзевую публіку. Бо ў нас цудоўны тэатр у цудоўным будынку, гістарычнай каштоўнасці.

Я лічу, што мне дастаўся самы прыгожы тэатр гэтай краіны. Так, цяпер лічу яго сваім. Вядома, нейкі час мне трэба, каб прывесці ўсё ў парадак, і, упэўнена, мы прагучым на ўсю рэспубліку.

***— Адна з нядаўніх гутарак з вамі мела падзагалоўкам вашы словы «пачну з кавярні» — гэта накіонт пераменаў у ТЮГу... Што б хацелася змяніць як найхутчэй?***

— Што б хацелася змяніць — павялічыць любоў гледачоў да гэтага тэатру. Я хачу, каб глядач марыў прыйсці ў наш тэатр. Гэта мара, напэўна, любога кіраўніка, каб білеты раскупляліся, як гарачыя піражкі. Гэта першае. Другое — мне хацелася б напоўніць тэатр жыццём, каб і ў кавярні, і ў фае яно віравала. Каб глядач заходзіў і адразу бачыў гісторыю тэатра. Каб сцены не былі голымі. Каб перш, чым ён увойдзе ў залу, ён мог бы нешта даведацца пра гэты тэатр з шасцідзесяціпяцігадовай гісторыяй. Не кожны тэатр у нашай краіне можа пахваліцца такой багатай гісторыяй.

***— Зразумела, зараз у ТЮГу будуць новыя спектаклі, праекты... Чытала пра рэжысёра з Венецыі, якога вы збіраецеся запрасіць...***

—Так, я з ім пазнаёмілася ў Санкт-Пецярбургскім Тэатры юнага гледача імя Бранцава — зусім нядаўна ў Феруча Мерызі адбылася там прэм'ера спектакля ў стылі дэль артэ. Вельмі хачу, каб такое з'явілася і на нашай сцэне. Літаральна заўтра я лячу ў Санкт-Пецярбург, на адкрыццё міжнароднага тэатральнага фестывалю «Радуга», будзем там шмат абмяркоўваць. Вось літаральна зараз, на 1 чэрвеня, плануем прэм'еру — «Кентэрвільскі прывід» у пастаноўцы Ганны Казловай, нашага маладога рэжысёра. На мастацкай радзе, калі прымалі, усе сказалі, што вельмі круты спектакль. Не магу з імі не згадзіцца. Далей — Тацяна Самбук, рэжысёр з Масквы, паставіць канцэрт-рэквіем па матывах «Альпійскай балады» Васіля Быкава. Да 22 чэрвеня плануем у тэатры прэм'еру. Пасля 24 чэрвеня едзем у Несвіжскі замак, іграць гэты канцэрт.

На пачатку ліпеня прыязджае Аляксандр Баркар, маскоўскі рэжысёр, які 29-30 ліпеня дасць прэм'еру «Фігара» Бамаршэ. Гэтымі праектамі мы таксама запаўняем нішу, якой нам не хапае — спектаклі 12+. А ў верасні тая самая Тацяна Самбук паставіць «Яўгена Анегіна», да якога ўжо ёсць агромністая цікавасць у нашых калег з Расійскай Федэрацыі, і ўжо чакаюць нас на вялікіх гастролях і ў Санкт-Пецярбургу, і ў Вялікіх Луках, і ў Пскове. Думаю, яшчэ шмат цікавых гарадоў пабачым... Зараз падалі заяўку на фестываль у Македонію, хочам паляцець са спектаклем «Муха-Цакатуха», і, магчыма, пераможам. Ну, а далей, напрыканцы года — навагодняя казкі! Што ж яшчэ?

> **«Спектакль — гэта таксама прадукт, які трэба добра прадаць. А для таго, каб яго прадаць, ён павінен быць лепшым. Нейкі час яшчэ можна на сваёй харызме, на сваіх сувязях, але пасля мой кліент проста скажа — вярніце грошы. Таму я павінна напаўняць тэатр добрым, якасным прадуктам».**

***— А як будзе адбывацца супраца з беларускімі аўтарамі?***

— Вось як толькі яны пачнуць пісаць тое, што мне спадабаецца — я адразу пастаўлю. Слова даю. Калі ўбачу беларускага аўтара, які ўразіць мяне назвой — несумненна... Пакуль я не знайшла свайго аўтара з сучасных, на жаль.

А так будзем браць беларускую класіку, або расійскую класіку перакладаць на беларускую мову. «Кентэрвільскі прывід» вось у нас выйшаў на беларускай мове. Я ж эканаміст-менеджар, я хачу прадаваць тое, што мы ствараем. Спектакль — гэта таксама прадукт, які трэба добра прадаць. А для таго, каб яго прадаць, ён павінен быць лепшым. Нейкі час яшчэ можна на сваёй харызме, на сваіх сувязях, але пасля мой кліент проста скажа — вярніце грошы. Таму я павінна напаўняць тэатр добрым, якасным прадуктам.

***— Значыць, беларуская класіка будзе па-ранейшаму прысутнічаць у ТЮГу?***

— Несумненна. Ніякія спектаклі з рэпертуару не здымаюцца. Мы проста запаўняем вечар — зараз у нас мала спектакляў, якія мы маглі б вечарам паказваць.



Фота sb.by

***— А як вы ставіцеся да «сінтэтычных» праектаў, калі тэатральнае мастацтва спалучаецца з іншымі жанрамі, да інклюзіўных спектакляў?***

— Вось якраз наконт «Яўгена Анегіна» ў мяне такая ідэя — увесці сурдапераклад. Для таго, каб людзі з асаблівасцямі слыху маглі прыходзіць на спектакль і атрымліваць тую ж асалоду ад дзейства, што і звычайныя людзі. І яшчэ я нядаўна ўдзельнічала ў тэатральным праекце з цікавым харэографам Кірылам Балтруковым, і вельмі хачу, каб у наступным годзе ён паставіў на сцэне нашага тэатра пластычны спектакль. Сучасны, які б мы маглі вазіць на фестывалі.

***— Тэатр юнага гледача — гэта не толькі дарослыя артысты, гэта яшчэ і дзеці на сцэне. Як вы ставіцеся да таго, калі дзеці напоўніцу задзейнічаныя ў спектаклях, цяжка працуюць, потым ім апладзіруе зала... Ці няма ў гэтым якой псіхалагічнай небяспекі для юных зорак?***

— У тэатральным праекце ТрыТфармаТ, якім я да нядаўняга часу кіравала, у двух з чатырох спектакляў працуюць дзеці. Я добра да гэтага стаўлюся. У навагодніх казках у мяне заўсёды працуюць дзеці, і ў вялікай, і ў малой зале Палаца Рэспублікі. Кажуць, што дзяцей і жывёл на сцэне перайграць немагчыма, таму гэта заўсёды вельмі прыкрашае. І мы далей будзем гэта выкарыстоўваць, калі дазваляе і драматургія, і задумка рэжысёра.

***— Ваш сын таксама іграе на сцэне, разам з вамі?***

— Так, Арцём з пяці гадоў на сцэне, і гастралюе ўвесь час. Я лічу, гэта лепей, чым ён бы сядзеў ля камп'ютара, ці з хлопцамі ў падваротні нейкімі пракудамі займаўся. А так ён займаецца творчасцю, знаёміцца з цікавымі людзьмі — музыкантамі з Прэзідэнцкага аркестра, з маімі артыстамі...

***— Гэта павінна вызначаць яго далейшы лёс?***

— Не, не, я ні ў якім разе не буду ўмешвацца — ён сам вызначыць сабе занятак. Ён занадта ў мяне разумны і не па гадах развіты, я думаю, ён знойдзе свой шлях.

***— Адзін ваш канцэрт называўся «З верай па жыцці». Вы веруючы чалавек? У чым ваша вера?***

— Так, я веруючы чалавек. Праваслаўны чалавек. Па магчымасці стараюся наведваць храмы. Нядаўна ў Пскове на гастролях, калі ў мяне вечарам быў складанейшы спектакль «Карэніна», напярэдадні я паехала за пяцьдзясят кіламетраў у Пскоўска-Пячэрскі манастыр, каб дакрануцца да святынь. А па жыцці мая вера — у людзей. У апошнія гады я атрымала шмат негатыву — і ўсё адно гэта не змяніла маю любоў і веру ў людзей, веру ў тое, што я прыйшла на гэтую зямлю, каб дарыць людзям радасць, наколькі я магу.

***— У вас, значыць, ёсць уласны рэцэпт супрацьстаяння негатыву?***

— Ведаеце, цягам апошніх трох гадоў я зразумела адно: калі мне плююць у спіну, значыць, я наперадзе. Я даказваю не словамі, а справамі, што я магу. І спадзяюся, што і Тэатр юнага гледача дасць мне шанц давесці, што яны са мной не пралічыліся.

***— Я ведаю, што вас называюць чалавекам-аркестрам... І усёткі — як збіраецеся ўсе свае занятк сумяшчаць? Ад нечага, магчыма, прыйдзецца адмовіцца?***

— Я ўжо адмовілася ад працы ў Тэатры-студыі кінаакцёра. Удзячная за дваццаць гадоў творчага жыцця там, але зразумела, што фізічна не змагу цягнуць рэпертуар — у мяне там вельмі шмат роляў. У Тэатры юнага гледача таксама пакуль іграць не плануючы. Мая акцёрская дзейнасць цяпер — працаваць на канале АНТ і ставіць спектаклі.

***— А тэатр ТрыТфармаТ, а кіно?***

— ТрыТфармаТ я пакуль перадала ў добрыя рукі, свайму старэйшаму сыну, а сама засталася там як актрыса. У кіно пакуль не здымаюся — апошнім часам у мяне няма ніводнай прапановы, можна пра яго ўжо забыць.

***— Але са сцэны вы ж не сыходзіце, праўда?***

— Ну вы што! Я лічу, што Рэспубліка Беларусь не павінна згубіць такую добрую артыстку, як я *(смяецца)*. Думаю, мае гледачы вельмі расперажываюцца, калі не змогуць бачыць мяне на сцэне.

***— А выкладаць працягнеце?***

— Так, я выкладаю ў Акадэміі мастацтваў, нагрузкі ў мяне там няшмат, усяго паўстаўкі. Гэта два разы на тыдзень. Зараз вяду два курсы. У мяне курс акцёраў лялечнага тэатра і акцёраў драмы.

***— Выкладаеце сцэнічны бой і фехтаванне па-ранейшаму?***

— Так, так, вядома! 31 снежня мне ўручылі пасведчанне дацэнта, так што я ўжо «аступенены дацэнт». Дваццаць два гады выкладаю... Я не магу гэта пакінуць.

***— Калі даведваешся, што вы выкладаеце такія «баявыя» прадметы, проста не адразу верыш... Праўда, у вас ёсць падставы — у вашых сваяках былі чэмпіёны па фехтаванні...***

— Былі... Але я сама ніколі не займалася спортам, акрамя таго, што заўсёды сачыла за сабой. Але калі ў Акадэміі мастацтваў у нас пачалі выкладаць фехтаванне, я зразумела, што гэта настолькі маё... Увогуле дынамічныя занятк мне заўсёды даваліся. І зараз на сцэне я шмат рухаюся, танцую, раблю складаную харэаграфію... Гавораць, у мяне добра атрымліваецца. А тое, што я стала выкладаць, дзякуй рэжысёру і педагогу Лідзіі Манаковай — менавіта яна ўбачыла гэта ўва мне, і яна, і мая мама проста мяне гвалтам прымусілі ісці выкладаць, але я не пашкадавала. Адчуванне маладой энергіі, знаёмства з маладымі артыстамі... У маім тэатральным праекце 70 працэнтаў — гэта мае студэнты.

> **«Што б хацелася змяніць — павялічыць любоў гледачоў да гэтага тэатра. Я хачу, каб глядач марыў прыйсці ў наш тэатр. Гэта мара, напэўна, любога кіраўніка, каб білеты раскупляліся, як гарачыя піражкі».**

***— А думаеце запісваць новыя песні?***

— Я ўвесь час спяваю. У кожным спектаклі. Кажуць, гэта добра, ды яшчэ пад жывы аркестр. Хоць, канешне, запісамі няма калі займацца. Пакуль я на сваім старым рэпертуары, і калі мяне просяць, выступаю на нейкіх канцэртах. Я не бачу патрэбы пакуль папаўняць свой рэпертуар.

***— Чула, што вы заўсёды абараняеце інтарэсы артыстаў... А між тым гавораць, што яны — самы складаны кантынгент, працаваць з імі цяжка...***

— Пачнём з таго, што артысты — гэта «штучны товар». Не можа чалавек з вуліцы быць артыстам. Ён павінен прайсці вельмі вялікі шлях. Дваццаць пяць гадоў я займаюся гэтай прафесіяй, і кожны дзень я вучуся, адкрываю ў сабе ўсё новыя грані свайго ўнутранага свету, каб яго падарыць гледачу. Калі ты хочаш быць класным артыстам, ты павінен вельмі шмат працаваць над сабой, 25/7, каб умець рабіць больш і лепш, чым іншыя. Таму і характар у нас складаны, і тэмперамент складаны. У нас вельмі рухомая псіхіка, і любое ўздзеянне звонку, вядома, узбуджае артыста. І таму ставіцца да яго трэба, практычна, як да дзіцяці. Я лічу, што артысты — гэта дзеці. І да магілы яны ў душы — дзеці. Калі людзі з табой засталіся, значыць, ты павінен за іх змагацца, за кожнага з іх.

Гутарыла
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении <u>21 июня 2022 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 85 %</u> по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | <u>**Условие продажи:**</u> **1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 % | | | |
